Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 21 1933 г. № 110 (4654)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

## СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Бальшавікі Чырвонай Слабады і Случчыны ў авангардзе спаборніцтва з Зах. вобласьцю. З. ГІНЗБУРГ—За разгорнуты савецкі гандаль на вёсцы (3 стар.). САЎКОЎ—Баявы экзамэн (2 стар.).

Сьледуйце прыкладу пралетарскіх цэнтраў! (2 стар.).

ШЫРОКА РАЗГОРНЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ (3 ст.).

ЗА МЯЖОЙ:

На фашысцкі паёк (4 стар.).

Турма за апашленьне фашысцкага сыкбалю (4 стар.).

Германія пад панаваньнем фашызму (4 стар.).

Антыяпонская дэманстрацыя Рузвэльта (4 стар.).

Урад ПАЗШ апублікаваў адказ тав. Калініна (4 стар.).

# Удзесяцярыўшы тэмпы і узьняўшы якасьць сяўбы, заваюем пяршынства у спаборніцтве з Зах. вобласьцю

## БАЛЬШАВІКІ ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЫ і СЛУЧЧЫНЫ— У АВАНГАРДЗЕ СПАБОРНІЦТВА З ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ

Першая вясна другой сацыялістычнай пяцігодкі паказвае, што адбыўся новы эрух у сьвядомасьці найшырэйшых мас калгаснага сялянства.

Калгасьнік ясна адчуў, што справа калгасная — непераможная, што звароту да старога няма і быць ня можа. Калгасьнік адчуў усе выгоды калектыўнай працы перад аднаасобнай.

«Як правіла, становішча ва ўсіх калгасах, якія колькі-небудзь умацаваліся, — а такіх у нас большасьць, — рэзка адрозьніваецца ад таго, што было адзін-два гады таму назад. Самі калгасьнікі вылучылі са свайго асяродзішча многія тысячы такіх перадавых работнікаў, сапраўдных ударнікаў, якія ў нас былі раней толькі на фабрыках і заводах» (**Молатаў**).

Практыка перадавых рэспублік і абласьцей Савецкага саюзу, з посьпехам скончыўшых сяўбу, пацьвярджае, што сацыялістычнае спаборніцтва на вёсцы ў гэтую вясну стала рухам найшырэйшых мас. Надзвычай узрасла сіла грамадзкага ўзьдзеяньня, сіла сацыялістычнага прыкладу.

У нас, у БССР, гэта лепш за ўсё пацьвярджаецца на практыцы такіх перадавых раёнаў, як **ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІ і СЛУЦКІ**, якія ўчора рапартавалі партыі і ўсёй краіне аб пасьпяховым завяршэньні сяўбы.

У гэтым годзе Случак скончыў сяўбу на 35 дзён раней, а Чырвоная Слабада на 20 дзён раней, чым у мінулым годзе.

У чым сакрэт перамогі перадавікоў? Чаму Случчына і Чырвоная Слабада вышлі на перадавыя пазыцыі спаборніцтва БССР з Заходняй вобласьцю?

Можа тут іншыя ўмовы, чым у другіх раёнах БССР? Можа тут глеба другая або клімат іншы, чым, скажам, у Бабруйску, або іншых суседніх раёнах?

Нічога падобнага. Нічым асаблівым Случак і Чырвоная Слабада ад Бабруйску не адрозьніваюцца.

Справа зусім простая. У Случку і Чырвонай Слабадзе мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі здолелі ўзначаліць той пералом, які адбыўся ў сьвядомасьці калгасных мас.

1 сапраўды. У Чырвона-Слабодзкім і Случкім раёнах уся маса калгасьнікаў была ўцягнута ў сацыялістычнае спаборніцтва.

І ў Чырвонай Слабадзе былі тэндэнцыі супроць раньняй сяўбы, былі тэндэнцыі зацягваць палявыя работы. Але атмасфэра грамадзкага ўзьдзеяньня, грамадзкага кантролю, якая была створана ў калгасах Чырвона-Слабодзкага раёну, дапамагла зусім лёгка перамагчы гэтыя тэндэнцыі, дапамагла ізаляваць антыкалгасныя элементы.

Тут сацыялістычныя дагаворы не засталіся пустымі абяцаньнямі, пустымі самазабавязацельствамі. Адзін правяраў работу другога. Перадавая брыгада, перадавы калгас цягнуў за сабой сваіх суседзяў, перадаючы свой вопыт адстаючым.

У калгасах Чырвонай Слабады і Случку ў гэтым годзе становішча карэнным чынам зьмянілася. Нікога ня прышлося ўпрошваць выходзіць на работу. Вакол працоўнай дысцыпліны, вакол сваячасовага выхаду на работу і барацьбы з прагуламі была так згуртавана калгасная грамадзкасьць, што калгасьнік сам шукаў работы, а не работа калгасьніка. Той самы лодыр, які раней разьлічваў, што за яго папрацуе іншы, у гэту вясну ў Чырвона-Слабодзкім і Случкім раёнах сам шукаў і патрабаваў сабе работы ў калгасных радох.

Такі пералом у сьвядомасьці калгасных мас Чырвонай Слабады і Случчыны невыпадковая рэч, ня вынік самацёку.

Гэта вынік сапраўднага бальшавіцкага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, вынік канкрэтнай апэрацыйнай арганізацыі палявых работ і дапамогі калгасам і аднаасобнікам.

Тут партыйныя і савецкія арганізацыі, закасаўшы рукавы, па-бальшавіцку ўваходзяць ва ўсе дробязі калгаснай вытворчасьці. Работа тут не ранесена ў нізы, у шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Даволі прывесьці той факт, што амаль ва ўсіх калгасах Чырвона-Слабодзкага раёну прагулы і спазьненьні на работу былі ліквідаваны. Або ўзяць аднаасобны сэктар. Яны сумленна выконвалі свае абавязкі перад дзяржавай. Аднаасобніку была аказана дапамога, яго работай кіравалі. Тут па маяталі, што працоўны аднаасобнік— наш заўтрашні калгасьнік, што яго нельга сьпіхваць в рахунку.

Бальшавіцкая практыка Случчыны і Чырвонай Слабады в усёй выразнасьцю паказвае, што БССР мае ўсе магчымасьці для таго, каб заваяваць у гэтым годзе высокі ўраджай, каб заваяваць пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Раённыя арганізацыі на аснове вопыту Случчыны і Чырвонай Слабады, на аснове вопыту перадавых рэспублік павінны ўсьвядоміць, што зараз **«наша задача ня ў масавых рэпрэсіях, а больш за ўсё, і галоўным чынам, у нашай палітычнай і арганізатарскай рабоце ў масах і ў поўнай ізаляцыі нашых ворагаў» (МОЛАТАЎ).**

Бальшавікі Случчыны, Чырвонай Слабады і ўсіх іншых раёнаў павінны памятаць, што барацьба за ўраджай сяўбой не канчаецца. Треба і надалей узначальваць гістарычны пералом, які адбываецца зараз у сьвядомасьці найшырэйшых калгасных мас, і накіроўваць яго па шляху, яркага асьветленым лёзунгам тав. **СТАЛІНА** — зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі і ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

## НА 35 ДЗЕН РАНЕЙ

СЛУЦАК, 20. (ПА ТЭЛЕФОНУ).

ДНІ ДРУГОЙ ДЭКАДЫ МАЯ БЫЛІ Ў РАЁНЕ ДНЯМІ НАПРУЖАНАЙ БАРАЦЬБЫ УСЁЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ І ПЕРАДАВЫХ АДНААСОБНІКАЎ СЛУЧЧЫНЫ ЗА ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ЦК І СНК, ЗА ПОЎНАЕ І ВЫСОКАЯКАСНАЕ ЗАВЯРШЭНЬНЕ СЯЎБЫ.

ФАКТ, ШТО НА 10 МАЯ СЛУЦКІ РАЁН ПА ТЭМПАХ СЯЎБЫ ЎСТУПІЎ ПЯРШЫНСТВО ЧЫРВОНАЙ СЛАБАДЗЕ, ПРЫВЕЎ У РУХ УСЮ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ, МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ.

ЛЁЗУНГ РАЁННАГА КАМІТЭТУ — АДВАЯВАЦЬ ПЯРШЫНСТВО, ЗАСЛУЖЫЦЬ УДАРНЫМ І ВЫСОКАЯКАСНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ СЬЦЯГ ЦК І СНК, ВЫЙСЬЦІ НА ПЕРАДАВЫЯ ПАЗЫЦЫІ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ—БЫЎ ГОРАЧА ПАДХОПЛЕН У КАЛГАСАХ, БРЫГАДАХ, НА ПАЛЁХ АДНААСОБНІКАЎ.

УЖО ДА 15 МАЯ РАЁН ДАБІЎСЯ ПЕРШАЙ ПЕРАМОГІ: НАЙВОЛЬШЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ ПА СЯЎБЕ ЯРАВЫХ У РЭСПУБЛІЦЫ. СЬЦЯГ ЦК І СНК ПЕРАШОЎ ДА СЛУЧЧЫНЫ.

ГЭТА, БЫЛО, АДНАК, ТОЛЬКІ ПЕРШАЙ І ДАЛЁКА НЯПОЎНАЙ ПЕРАМОГАЙ.

СЛУЦКІЯ БАЛЬШАВІКІ ПАСТАВІЛІ ПЕРАД САБОЙ, ПЕРАД КАЛГАСЬНІКАМІ І ПРАЦОЎНЫМІ АДНААСОБНІКАМІ ЗАДАЧУ—ДА 20 МАЯ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЦЬ УВЕСЬ ЯРАВЫ КЛІН.

19 МАЯ БЫЎ РАШАЮЧЫ ДЗЕНЬ. БІЛІСЯ ЗА ТЭМПЫ, ЗА ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ КОЖНАГА ГЭКТАРА. З САМАЙ РАНІЦЫ ПАСТУПАЮЦЬ ЗВОДКІ І РАПАРТЫ АБ СКАНЧЭНЬНІ СЯЎБЫ. НА ЖАЛЬ, ЯШЧЭ НЯ ЎСЕ СЕЛЬСАВЕТЫ ПРЫСЛАЛІ ПОЎНЫЯ ВЕСТКІ, АЛЕ ЎЖО І ПАПЯРЭДНІЯ ДАНЫЯ ГАВАРЫЛІ ПРА ДАСЯГНУТЫЯ ПОСЬПЕХІ.

РАЁННЫ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН НА 100,88 ПРОЦ. НА 19 МАЯ ЗАСЕЯНА 38.458 ГЭКТАРАЎ. (ПЛЯН—38.120).

ЛЕТАСЬ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ПА СЛУЦКІМ РАЁНЕ БЫЎ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ ДА 25 ЧЭРВЕНЯ. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ, ТАКІМ ЧЫНАМ, ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН НА **35 ДЗЁН РАНЕЙ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ.**

САЎГАСЫ ЗАСЕЯЛІ 938 ГА, КАЛГАСЫ—23.214,87 ГА, АДНААСОБНІКІ —1.689,17 ГА.

ПА КУЛЬТУРАХ НАСТУПНЫЯ ЛІЧБЫ: ПЛЯН СЯЎБЫ АЎСА ВЫКАНАН НА 104,78 ПРОЦ., ПА ІНШЫХ ЗБОЖЖАВЫХ—110,19 ПРОЦ. ПЛЯН СЯЎБЫ ІЛЬНУ ВЫКАНАН НА 101,39 ПРОЦ.; БУЛЬБЫ—103,74 ПРОЦ. І Г. Д.

У АВАНГАРДЗЕ ІДУЦЬ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ: ВЯЛІКАСЬЛІЎСКІ—103,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ, ПЕРШАМАЙСКІ — 101 ПРОЦ. І ГРЭСКІ—102 ПРОЦ. БЕЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, СКОНЧЫЎШЫ СЯЎБУ ЯРАВЫХ, АРГАНІЗАВАЎ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ ДЛЯ ПРОДАЖУ ДЗЯРЖАВЕ.

КАЛГАСЫ РАЁНУ ДЗЕЙНАСЬЦІ СЛУЦКАЙ МТС—55 КАЛГАСАЎ—ДА 19-ГА ВЫКАНАЛІ ПЛЯН ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ НА 107 ПРОЦ., З ЯКІХ 5 ПРОЦ. ЗА ЛІК НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ.

РАЁННЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ ЗАКЛІКАЎ УСІХ КАМУНІСТАЎ, УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ, КАБ ПЛЯН СЯЎБЫ БЫЎ ПОЎНАСЬЦЮ І НЕАДКЛАДНА ВЫКАНАН КОЖНЫМ КАЛГАСАМ, КОЖНЫМ ПРАЦОЎНЫМ АДНААСОБНІКАМ, КАБ ЦАЛКАМ ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ ПА ЎСІХ КУЛЬТУРАХ.

У РАЁНЕ АРГАНІЗУЕЦЦА МАСАВАЯ ПРАВЕРКА ЯКАСЬЦІ ПАЛЯВЫХ РАБОТ. РАЙКОМ КП(б)Б ПРЫНЯЎ ПРАКТЫЧНЫЯ МЕРЫ ПА АБМЕНУ ВОПЫТАМ СВАЙ БАРАЦЬБЫ З КАЛГАСЬНІКАМІ І ПРАЦОЎНЫМІ АДНААСОБНІКАМІ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ, З ЯКІМІ СПАБОРНІЧАЕ СЛУЧЧЫНА.

## Друк Заходняй вобласьці—ў барацьбе за якасьць сяўбы

СМАЛЕНСК, 19.

Камісія па правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае завяршэньне сяўбы паміж Заходняй вобласьцю і БССР склікала нараду работнікаў друку, зямельных органаў і камсамолу.

На нарадзе былі заслуханы інфармацыйныя паведамленьні аб ходзе спаборніцтва.

Прадстаўнік газэты **«РАБОЧИЙ ПУТЬ»** тав. Кісялёў у сваім выступленьні падкрэсьліў, што газэта галоўны ўпор зрабіла на праверку выкананьня раёнамі сваіх абавязацельстваў. Пры непасрэдным удзеле газэты арганізавана ўзаемаправерка выкананьня дагавору на лепшае правядзеньне сяўбы паміж Ржэўскім, Вяземскім, Сафонаўскім, Іньдзешкаўскім, Сычаўскім і Новадушанскім раёнамі.

Цікавы вопыт работы правяла газэта **«БОЛЬШЕВИТСКИЙ МОЛОДНЯК».** Тав. Азараў у сваім выступленьні падзяліўся аб практыцы работы газэты ў барацьбе за якасьць палявых работ. Па ініцыятыве рэдакцыі ў радзе калгасаў былі арганізаваны групы браке ражу. Гэтыя групы, у якія ўваходзяць лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі, сочаць за якасьцю ворыва і сяўбы кожнай брыгады, кожнага калгасьніка. Аб кожным факце дрэннай работы група бракеражу паведамляе брыгадзірам. Дрэнная работа адразу-ж выпраўляецца, а на віноватых ускладаецца адпаведнае спагнаньне. У чатырох раёнах газэта арганізавала праверку ўдзелу камсамольскіх арганізацый у сацыялістычным спаборніцтве.

Загадчык агітмасавага аддзелу абкому УсеКП(б) падкрэсьліў, што з 74 раёнаў, якія заключылі паміж сабой дагавары, сапраўднае спаборніцтва разгарнулася толькі ў 4-5 раёнах.

Буйнейшым недахопам зьяўляецца тое, што са спаборніцтва выпаў аднаасобнік. Гэты недахоп трэба адразу-ж выправіць. Калгасы павінны адказваць ня толькі за выкананьне свайго пляну, але і за ход сяўбы ў суседніх аднаасобных гаспадарках.

Трэба разгарнуць грамадзкі буксір перадавых калгасаў над адстаючымі. У прыватнасьці, з двух калгасаў, якія спаборнічаюць паміж сабой, перадавы калгас павінен браць на грамадзкі буксір адстаючы.

Старшыня камісіі тав. **ШЭЙДЛІНА,** падагульваючы вынікі нарады, падкрэсьліла, што ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва прымае ўдзел, галоўным чынам, толькі друк; абласныя арганізацыі (аблзу, трактарацэнтры, упаўнаркамсаўгасаў) невыстарчальны прымаюць удзел, ніякага спаборніцтва.

Рэдакцыі газэт «Рабочий путь» і «Большевитский молодняк» рыхтуюць абменныя палосы для «Зьвязды» і «Чырвонай зьмены», у якіх яны пакажуць вопыт перадавых калгасаў і саўгасаў Заходняй вобласьці ў барацьбе за хутчэйшае і лепшае правядзеньне сяўбы.

## КЛЯТВЫ, НЕ ПАДМАЦАВАНЫЯ СПРАВАЙ

### ЯК БАБРУЙСК ВЫКОНВАЕ СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

БАБРУЙСК, 19. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Бабруйскі раён спаборнічае са Случчынай на лепшае правядзеньне сяўбы.

Яшчэ перад усебеларускім зьездам калгасьнікаў-ударнікаў у Бабруйску на раённым зьлёце былі прыняты самыя шырокія і прыгожыя абавязацельствы.

«Мы ўзорна правядзем сяўбу, — горача заяўлялі бабруйчане ў сваіх абавязацельствах,—мы цалкам засеем сваю зямлю, засеем не добра, заваюем нашаму раёну першае месца...»

Далей ідзе безліч сталёгічных заяў, абяцаньняў, клятваў...

Калі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў заключыў сацыялістычны дагавор з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, Бабруйск пасьпяшыў папоўніць сьпіс сваіх абавязацельстваў.

У прыватнасьці, раён даваў слова: «...забясьпечыць правядзеньне сяўбы па збожжавых за 12 дзён і па бульбе — за 15, збожжавых ня менш 10 цэнтнэраў з га» і г. д.

Дагавор прынялі, абавязацельствы ўхвалілі, сказалі, што спаборнічаюць са Случчынай на лепшае правядзеньне сяўбы і...

Забылі, самым сапраўдным чынам забылі аб тым, што самі-ж абяцалі, што самі-ж прымалі, забылі, што спаборнічаюць яны са Случкам, з калгасамі Заходняй вобласьці.

Прайшоў дзень, другі, тыдзень і ўсё змоўкла. Пра дагаворы, пра прынятыя самаабавязацельствы больш ніхто не ўспамінаў.

Адсюль і вынікі. Ні адзін пункт дагавору ня выканан, ні адно абавязацельства не ажыцьцёўлена.

Абяцалі засеяць збожжавыя за 12 дзён. А засеялі да 15 мая менш 70 проц. пляну па збожжавых. Плян сяўбы яравых на 15 мая Бабруйшчына выканала толькі ў разьмеры 54,8 проц.

А Случак, з якім Бабруйскі раён спаборнічае, перавыканаў ужо сваё заданьне па яравых, засеяўшы яравыя на 35 дзён раней, чым у мінулым годзе.

Чаму Бабруйск так адстаў? Чаму дагавор, прыняты раёнам, застаўся толькі паперкай?

У раёне фактычна ніхто нават і не падумаў, каб на справе, канкрэтна разгарнуць масавую і арганізатарскую работу па спаборніцтве. Усё было пушчана на самацёк.

Не анадзот, а факт: у Бабруйску яшчэ і па сёньняшні дзень ніяк ня могуць выразьніць, хто практычна павінен кіраваць работай па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

Сакратар РК КП(б)Б т. **БАЎКОВІЧ** ня мог нам даць, літаральна, ні аднаго канкрэтнага адказу па пытаньнях спаборніцтва са Случчынай. Тав. Ваўковіч шчыра і катэгарычна заявіў:

— Нічога я ня ведаю!..

У рэдакцыі раённай газэты **«КАМУНІСТ»** — тое-ж самае. Ад рэдактара «Камуніста» тав. **ГРЫНГЛАЗА** мы атрымалі аналёгічны адказ. Невышадкова. За ўвесь час газэта ня дала амаль ніякіх матэрыялаў аб ходзе спаборніцтва са Случчынай. Адным словам — поўнае маўчаньне.

Кантроль за якасьцю зусім не арганізован. Сеюць у аднавор, сеюць уроскід, а радковыя сявяркі стаяць. Даволі ўказаць, што калгас «Прамень камуны» засеяў у аднавор 90 га збожжавых. У калгасе ёсьць радковая сявярка, аднак, ні адзін гэктар яравога кліну не засеян радковым спосабам.

Аднаасобнікі павінны засеяць 70 проц. яравога кліну. Масавая і арганізатарская работа сярод аднаасобнікаў, аднак, разгорнута зусім слаба. Аднаасобнік гнаруецца. У выніку — рэзкае адставаньне ў сяўбе. Нават па аўсу плян выканан толькі на 50 проц.

***

Бабруйская арганізацыя і ў першую чаргу райком павінны зрабіць належны вывад з гэтых фактаў. Патрэбны ня клятвы, не абяцаньні, а справа.

Задача бабруйскай арганізацыі і яе кіраўніцтва на справе разгарнуцца, узначаліць сацспаборніцтва, каб дабіцца перамогі на фронце сяўбы ў бліжэйшыя дні.

П. Ч.

## НАДЗЕІ І САПРАЎДНАСЬЦЬ

МАЗЫР, 18. (АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

На трэцюю пяцідзеўку мая ў Мазыры ўскладалі вялікія надзеі. І ў райкоме, і ў райвыканкоме, і ў сельсаветах меркавалі за гэтыя пяць дзён поўнасьцю засеяць збожжавыя, лён і бульбу.

Гара нарадзіла мыш. Надзеі не апраўдаліся. Да 15 мая плян па збожжавых выканан толькі на 56,8 проц., па ільну—68,3 і бульбе—58,2 проц.

Самацёк дае сябе адчуваць. Асабліва трывожнае становішча з сяўбой на аднаасобных гаспадарках. Аднаасобнікі рэзка адсталі ад саўгасаў і калгасаў.

Саўгасы Мазыршчыны ўжо скончылі сяўбу збожжавых. Калгасы таксама. А па аднаасобных гаспадарках плян сяўбы нават такой раньняй культуры, як авёс, выканан усяго на 68 проц. Заданьне па яравых выканана толькі на 39,9 проц.

Сярод аднаасобнікаў зусім не разгорнута масавая і арганізатарская работа. Не выкрываецца шкодніцтва старых дзедаўскіх традыцый позьняй сяўбы. Нельга назваць, літаральна, ні аднэй вёскі, ні аднаго сельсавету, дзе сапраўды быў бы папулярызаваны закон аб абавязковай пастаўцы збожжа і іншых с.-г. прадуктаў дзяржаве. І па сёньняшні дзень многім аднаасобнікам нават ня ўручаны абавязацельствы па пастаўцы с.-г. прадуктаў.

Стаўка на самацёк рэзка адчуваецца ня толькі ў ходзе сяўбы па аднаасобным сэктары. Аслабілі тэмпы сяўбы і па калгасах, асабліва на саўгасах.

Факт перавыкананьня плянаў па сяўбе раньніх збожжавых закружыў галовы мясцовым работнікам. Людзі супакоіліся, не разгарнуўшы сапраўднай эпэргічнай барацьбы за хутчэйшае сканчэньне сяўбы бульбы і ільну.

Сяўба тэхнічных і прапашных ганеб на зацягваецца. Даволі ўказаць, што саўгасы засеялі да 15 мая толькі 98 га бульбы—37,9 проц. пляну.

Зацягваюць сяўбу прапашных і калгасы—толькі 66 проц. пляну па бульбе.

Мазыр спаборнічае з Рэчыцай. Становішча на сёньняшні дзень не на карысьць Мазыршчыны.

Раён адстаў.

Мазырская партарганізацыя павінна рашуча скончыць з гэтым, зусім нецярпімым адставаньнем. Усе магчымасьці для гэтага ёсьць. У раёне няма ні калгасаў, якія ўжо цалкам засеялі ўсе яравыя—«Новы быт», імя Варашылава, імя Молатава і г. д. Гэтыя калгасы, засеяўшы яравыя, зараз ударна рыхтуюцца да ўборкі.

Так павінен працаваць увесь раён у цэлым.

С. ГАЛКІН.

## ЦК КП(б)Б—т.ГІКАЛО, СНК БССР--т.ГАЛАДЗЕДУ, НКЗБ--т.-БЭНЭКУ, газ. „ЗЬВЯЗДА“

### РАПАРТ

На 19 мая агульны плян сяўбы па Случкім раёне выканан на 100,88 проц. Плян сяўбы аўса выканан на 104,78 проц., збожжавых—на 110,19 проц., бульбы — на 103,43, Ільну—на 101,39 проц.

Усяго засеяна 38.458 гэктараў, замест 38.120 га, вызначаных паводле пляну.

Сакратар РК КП(б)Б СОСКІН

Старшыня РВК КНЯЗЁЎ.

Загадчык райза ЗЭЛЬДЗІН.

## САЎГАС ЛЯСКІ ЗАВЯРШЫЎ СЯЎБУ

ПАРЫЧЫ, 19.

ПЕРАКЛЮЧЫЎШЫСЯ НА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ, САЎГАС ЛЯСКІ, ПАРЫЦКАГА РАЁНУ, 16 МАЯ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ. ПЛЯН ПА ЎСІХ КУЛЬТУРАХ ВЫКАНАН. АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ЗЬВЕРНУТА НА ВЫКАНАНЬНЕ АГРАПРАВІЛ.

УДАРНІКІ САЎГАСУ НА ЧАЛЕ З БУХЛАКОМ, ЛАПЦЕВЫМ І НАВУЕВЫМ НАЗАЎТРА 17 МАЯ ВЫЕХАЛІ НА ДАПАМОГУ СУСЕДНЯМУ ЯЎРЭЯСКАМУ НАЦЫЯНАЛЬНАМУ КАЛГАСУ «САЦЫЯЛІСТЫШЭР ВЭГ» (м. ШЧЭДРЫН). УСЬЛЕД ЗА ІМІ ПРЫБЫЛІ ДВА САЎГАСНЫХ ТРАКТАРЫ.

РАБОЧЫЯ І ТРАКТАРЫСТЫ ДАПАМАГЛІ КАЛГАСУ ВЫВЕЗЬЦІ ГНОЙ НА 5 ГЭКТАРАЎ ГАРОДНІНЫ.

ХАРАКТЭРНА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО РАЗАМ З УДАРНІКАМІ Ў КАЛГАС ПРЫБЫЎ І САЎГАСНЫ КОНЮХ, ЯКІ НІКОМУ НЕ ЗАХАЦЕЎ ДАВЕРЫЦЬ СВАІХ КОНЯЙ.

Г.

## РАПАРТ

### ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

У барацьбе за якасьць, за якасьць першай сяўбы другой пяцігодкі калгас «КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ», Раманскага сельсавету, дабіўся рашучай перамогі: яравы плян засеяны за ўстановленыя тэрміны і ўрадны тэрміны [illegible] — да 20 мая.

Усяго засеяна 651 гэктар.

Не паслабляючы тэмпаў, калгас перакліча ўся на прапашна-прапоўнаўныя работы.

Праўленьне калгасу МАКАРЭВІЧ.

## РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКА ПА СПАБОРНІЦТВЕ З ЗАХ. ВОБЛАСЬЦЮ

# ВУЧЫЦЦА У ПЕРАДАВІКОЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Альпё... альпё...

Пачынаем усебеларускую радыёнараду аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва па сяўбе з Заходняй вобласьцю.

Старшыня камісіі па спаборніцтве з Зах. вобласьцю пры ЦК КП(б)Б тав. КАРТУКОЎ ва ўступным слове падкрэсьлівае, што задачай нарады зьяўляецца падагуліць папярэднія вынікі спаборніцтва, перадаць вопыт перадавых раёнаў адстаючым.

Альпё... альпё... выклікаем Гарадок, Чашнікі, Клімавічы, Случак, Чырвоную Слабаду...

### ЯК ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА ЗМАГАЛАСЯ ЗА ПЕРАМОГУ

Ля мікрафону сакратар ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА райкому партыі тав. КРАЦЭР, які перадае вопыт барацьбы Чырвонай Слабады за датэрміновае сканчэньне сяўбы.

Калгасы і аднаасобнікі Чырвона-Слабодзкага раёну да 19 мая выканалі плян сяўбы на 101 проц., саўгасы на 98,4 проц.

Чым-жа тлумачыцца посьпех Чырвонай Слабады. Можа там глеба іншая, можа там клімат другі? Нічога падобнага. Нічым асаблівым Чырвоная Слабада не адрозьніваецца ад іншых раёнаў БССР.

У барацьбу за датэрміновае сканчэньне сяўбы тут сапраўды былі ўцягнуты шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Масавая растлумачальная работа вялася не наскокам, ня рыўкамі, а штодзенна, сыстэматычна.

Такі мэтад масавай работы, як ПАЛІТГАДЗІНА, быў шырока скарыстан у калгасах Чырвонай Слабады. У часе абедзенага перапынку, ля стайні, на калгасным двары, дзе зьбіраюцца калгасьнікі, штодзенна праводзіліся гутаркі на розныя тэмы. Былі дэталёва прапрацаваны прамовы т. Сталіна і па станова пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб рабоце на вёсцы, пытаньне агратэхніні, падзеі ў Нямеччыне і інш.

Прайшоў дзень, другі, тыдзень і ўсё змоўкла. Пра дагаворы, пра прынятыя самаабавязацельствы больш ніхто не ўспамінаў.

Адсюль і вынікі. Ні адзін пункт дагавору ня выканан, ні адно абавязацельства не ажыцьцёўлена.

Абяцалі засеяць збожжавыя за 12 дзён. А засеялі да 15 мая менш 70 проц. пляну па збожжавых. Плян сяўбы яравых на 15 мая Бабруйшчына выканала толькі ў разьмеры 54,8 проц.

А Случак, з якім Бабруйскі раён спаборнічае, перавыканаў ужо сваё за даньне па яравых, засеяўшы яравыя на 35 дзён раней, чым у мінулым годзе.

Чаму Бабруйск так адстаў? Чаму дагавор, прыняты раёнам, застаўся толькі паперкай?

У раёне фактычна ніхто нават і не падумаў, каб на справе, канкрэтна разгарнуць масавую і арганізатарскую работу па спаборніцтве. Усё было пушчана на самацёк.

Не анадзот, а факт: у Бабруйску яшчэ і па сёньняшні дзень ніяк ня могуць выразьніць, хто практычна павінен кіраваць работай па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

Сакратар РК КП(б)Б т. **БАЎКОВІЧ** ня мог нам даць, літаральна, ні аднаго канкрэтнага адказу па пытаньнях спаборніцтва са Случчынай. Тав. Ваўковіч шчыра і катэгарычна заявіў:

— Нічога я ня ведаю!..

У рэдакцыі раённай газэты **«КАМУНІСТ»** — тое-ж самае. Ад рэдактара «Камуніста» тав. **ГРЫНГЛАЗА** мы атрымалі аналёгічны адказ. Невышадкова. За ўвесь час газэта ня дала амаль ніякіх матэрыялаў аб ходзе спаборніцтва са Случчынай. Адным словам — поўнае маўчаньне.

Кантроль за якасьцю зусім не арганізован. Сеюць у аднавор, сеюць уроскід, а радковыя сявяркі стаяць. Даволі ўказаць, што калгас «Прамень камуны» засеяў у аднавор 90 га збожжавых. У калгасе ёсьць радковая сявярка, аднак, ні адзін гэктар яравога кліну не засеян радковым спосабам.

Аднаасобнікі павінны засеяць 70 проц. яравога кліну. Масавая і арганізатарская работа сярод аднаасобнікаў, аднак, разгорнута зусім слаба. Аднаасобнік гнаруецца. У выніку — рэзкае адставаньне ў сяўбе. Нават па аўсу плян выканан толькі на 50 проц.

***

Бабруйская арганізацыя і ў першую чаргу райком павінны зрабіць належны вывад з гэтых фактаў. Патрэбны ня клятвы, не абяцаньні, а справа.

Задача бабруйскай арганізацыі і яе кіраўніцтва на справе разгарнуцца, узначаліць сацспаборніцтва, каб дабіцца перамогі на фронце сяўбы ў бліжэйшыя дні.

П. Ч.

### ВОПЫТ СЛУЧЧЫНЫ

Случчына засеяла 38.458 га—100,88 проц.

Тав. Соскін перадае практыку перадавых калгасаў Случчыны ў барацьбе за раньнія тэрміны сяўбы.

КАЛГАС «1-ГА МАЯ». Тут частка поля ў нізінах была затоплена вадой. Але гэта ня спыніла калгасьнікаў. Праз калгасныя палі былі прарыты ка напы. Вада зышла і праз дзень-два, калі падсохла глеба, пачалося ворыва. Усё поле добра ўгноена. На звышраньніх засевах вельмі добрыя ўсходы. У адстаючыя суседнія калгасы былі пасланы буксірныя брыгады.

Случчына спаборнічае на лепшае правядзеньне сяўбы з Бабруйскам, але ўвага ўсёй партарганізацыі была пры кавана да Чырвонай Слабады, якая атрымала пераходны сьцяг.

Адзяваўшы пераходны сьцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР у Чырвонай Слабады, мы цьвёрда парашылі трымаць яго да канца ўборачнай кампаніі.

Тав. Соскіна па мікрафону зьмяняе прадстаўнік цэнтральнай конкурснай камісіі па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю тав. КУРЦІК, які зараз знаходзіцца ў Случку.

### БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ ЗАХ. ВОБЛАСЬЦІ

Тав. Курцік перадае вопыт Заходняй вобласьці, з якой БССР спаборнічае на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы.

Чым характарызуецца ход палявых работ у Заходняй вобласьці—гэта барацьбой за якасьць. У калгасах Заходняй вобласьці шырокая сетка камісій па праверцы якасьці.

Вялікую ролю ў барацьбе за пён адыгрываюць старыя ільнаводы-вопытраў, Старыцкага раёну, дабіўся 4 цэнтнэраў ільну з гэктара.

Барацьба за якасьць памножана на бальшавіцкія тэмпы, 70 проц. плошчы яравых падрыхтавана для сяўбы.

Вялікая ўвага тут аддана аграўпаў наважаным, якія зьяўляюцца моцным вагаром для ўзьдзейнасьці на аднаасобны сэктар. Напрыклад, у Почапскім раёне аграўпаўнаважаны Шашкін Іван Максімавіч першым пачаў сяўбу і зрабіў уплыў на аднаасобнікаў сваёй вёскі.

БССР павінна пераняць гэты лепшы станоўчы вопыт Заходняй вобласьці, каб у бліжэйшыя дні дабі

# СЬЛЕДУЙЦЕ ПРЫКЛАДУ ПРАЛЕТАРСКІХ ЦЭНТРАЎ

## РАБОЧЫЯ САУГАСАЎ І МТС, КАЛГАСЬНІКІ І ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІКІ, СКАРЫСТАНЬНЕМ ВОПЫТУ ПЕРАДАВЫХ, ЗАБЯСЬПЕЧЦЕ ДАТЭРМІНОВУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ „ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ"!

### Пад кіраўніцтвам нашага правадыра тав. Сталіна пойдзем да новых перамог

Агульнамаскоўскі мітынг, прысьвечаны пазыцы, зьвярнуўся да ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНА з прывітаньнем:

«Ударнікі і ўдарніцы фабрык і заводаў Масквы, навуковыя работнікі і вучоныя, сабраўшыся на агульна-гарадзкі мітынг, прысьвечаны падвядзеньню вынікаў рэалізацыі «пазыкі другой пяцігодкі», шлюць гарачае прывітаньне ленінскаму ЦК УсеКП(б) і першаму ўдарніку вялікай Савецкай краіны, правадыру і настаўніку працоўных усяго сьвету—тав. Сталіну.

Рабочыя і работніцы, усе працоўныя Сталіцы Савецкага Саюзу ўжо 16 мая перавыканалі вызначаны для Масквы плян рэалізацыі «пазыкі другой пяцігодкі» і гэтым яшчэ і яшчэ раз даказалі сваё бязьмежнае давер'е нашай роднай УсеКП(б) і яе генэральнай лініі, сваю непахісную волю да ажыцьцяўленьня вялікіх задач другой бальшавіцкай пяцігодкі, сваю непахісную адданасьць справе сацыялізму.

«Без кабальных крэдытаў і пазык звонку», упасныя сіпамі мы ператварылі нашу краіну з аграрнай у індустрыяльную. Гэтай найвялікшай барацьбой у гісторыі чалавецтва кіравала і кіруе ленінская партыя і на чале яе ты, наш празарлівы кіраўнік і правадыр, найвялікшы стратэг бальша візму—наш Сталін.

Кожны рабочы і калгасьнік нашай краіны вельмі добра ведае, што яго працоўныя рублі, укладзеныя ў сацыялістычныя пазыкі,—гэта новыя аўта мабілі, трактары, новыя гіганты сацыялістычнай індустрыі і сельскай гаспадаркі; гэта—новы ўздым матар'яльна-культурнага ўзроўню працоўных.

Пад кіраўніцтвам нашага Цэнтральнага Камітэту на чале з тав. СТАЛІНЫМ рабочыя і ўсе працоўныя Масквы атрымалі бліскучыя перамогі ў першай пяцігодцы.

Пад кіраўніцтвам нашага правадыра тав. СТАЛІНА мы пойдзем да новых перамог у барацьбе за ажыцьцяўленьне пляну другой пяцігодкі, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, за перамогу міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ДРУГАЯ ПЯЦІГОДКА!

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАША МАГУТНАЯ, ВЯЛІКАЯ ПАРТЫЯ ЛЕНІНА І ЯЕ ЦК!

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ ПРАВАДЫР І НАСТАЎНІК, НАШ УЛЮБЁНЫ ПРЫЯЦЕЛЬ, І ТАВАРЫШ—СТАЛІН!»

Апрача таго, пасланы прывітаньні ЦВК СССР—тав. КАЛІНІНУ, СНК СССР—т. МОЛАТАВУ і МК УсеКП(б)—т. КАГАНОВІЧУ.

### Вопыт гораду—калгаснай вёсцы

Працоўныя чырвонай сталіцы Беларусі Менску, а таксама пралетары Віцебску і Гомелю на працягу пяці дзён плян рэалізацыі «пазыкі другой пяцігодкі» выканалі. Даўшы ў пазыку дзяржаве па Менску 9.368 тыс. руб., Віцебску больш 4,2 млн. руб. і Гомелю 4.321 тыс. руб., рабочыя і калгасьнікі лішні раз прадэманстравалі сваю адданасьць партыі і цьвёрдую непахісную волю змагацца пад сьцягам Леніна і выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Гэтых посьпехаў працоўныя Менску, Віцебску і Гомелю дабіліся выключна ў выніку правільнага кіраўніцтва з боку партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый, шырока разгорнутай палітычна-масавай работы і правільнай расстаноўкі сіл.

Вопыт работы Менску, які выканаў плян рэалізацыі пазыкі і на вёсцы, павінен навучыць усе гарады і раёны як трэба змагацца за выкананьне заданьня.

Першымі па Менску скончылі рэалізацыю пазыкі вядучыя прадпрыемствы—машынабудаўнічы завод імя Варашылава, «Камунар», «Ударнік», «Бальшавік», абутковая фабрыка «Кастрычнік», дрэваапрацоўчы завод імя Молатава, друкарня імя Сталіна і інш.

Для правядзеньня вынікаў рэалізацыі і абмену вопытам работы ЦП саюзу машынабудаўнічых рабочых 18 мая ў садзе «Прафінтэрн» арганізаваў палітнасоўку рабочых прадпрыемстваў, якія скончылі падпіску. Палітнасоўка паказала, што посьпехі ў рэалізацыі пазыкі па Менску дасягнуты дзякуючы таму, што ў практычную работу па правядзеньні кампаніі былі ўцягнуты шырокія працоўныя масы, што гэта работа праводзілася ў парадку разгортваньня сацыябарніцтва і ўдарніцтва.

Ня ўсе, аднак, раёны гэта ўмелі. З матар'ялаў, якія сёньня друкуюцца ў «Зьвязьдзе», відаць, што прапойскія раённыя арганізацыі правялі поўнае неразуменьне, палітычнай важнасьці пасьпяховага правядзеньня рэалізацыі пазыкі, не прынялі адпаведных мер да разгортваньня кампаніі. На лепш справа па Смалявіцкім і Пухавіцкім раёнах, дзе да рэалізацыі пазыкі амаль не прыступілі яшчэ і да сёньняшняга дня.

Як Менск, Віцебск, Гомель, так і ўсе іншыя гарады і раёны не павінны аслабляць работы. У пераважнай большасьці раёнаў і асабліва на вёсцы кампанія рэалізацыі па сутнасьці яшчэ не распачата.

Вопыт масавай работы гораду, яе формы і мэтады павінны быць цалкам перанесены ў саўгасы і калгасы, непасрэдна на поле, у кожную брыгаду, да кожнага рабочага, да кожнага калгасьніка.

Партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі, і саветы, па прыкладу Менску, Віцебску і Гомелю, работу па рэалізацыі пазыкі павінны ўзяць пад свой непасрэдны нагляд і забясьпечыць штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва ёю.

### Сакратару прапойскага райпарткому тав. Паповічу некалі займацца пазыкай

У справе зрыву рэалізацыі пазык і плянаў мабілізацыі сродкаў Прапойскі раён мае вялікі-нейшы «вопыт». Ён нікому ня здаў апошняга на БССР месца па рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага». Плян мабілізацыі сродкаў па ашчадсправе ў першым квартале гэтага году ім выкананы толькі на 17,9 проц., у тым ліку па ўкладах 50,3 проц., пазыцы—8,1 проц. Другі квартал раён выконвае ня лепш.

РК КП(б)Б не ўзначаліў вялізарнейшага энтузіязму працоўных мас вакол «пазыкі другой пяцігодкі». Моўчкі, міма гэтай кампаніі прайшла і раённая газэта Прапойчыны.

Акрамя ашчадкасы ніхто ў раёне пытаньнямі пазыкі не займаецца. Скліканьне нарад па пазыцы сакратаром РК КП(б)Б т. Паповічам забаронена. Пры зваротце да яго аб дапамозе ў правядзеньні гэтай кампаніі, тав. Паповіч адказаў: «у даны момант займацца пытаньнямі рэалізацыі пазыкі РК ня мае магчымасьці».

Аб газэце тав. Паповіч заявіў, што «райгазэта нам патрэбна для асьвятленьня пасеўкампаніі».

Кіраўніцтва Прапойскага раёну не зразумела палітычнай важнасьці пазыкі першага году другой пяцігодкі.

ЦКК КП(б)Б павінна неадкладна зрабіць адпаведныя вывады па гэтай справе.

С. Б.

### ЦК КП(б)Б т. Гікало, ЦВК БССР т. Чарвякову, СНК БССР т. Галадзеду, ЦСПСБ т. Кавальчуку

## РАПАРТ

Сёньня, 19 мая, а 17 гадзіне рабочыя, ІТР, служачыя і працоўныя сталіцы Савецкай Беларусі, а таксама калгасьнікі Менскага раёну пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б атрымалі яшчэ адну перамогу ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Агульнае заданьне па горадзе і раёну па падпісцы на «пазыку другой пяцігодкі» ў 9.272.000 руб. выканана па горадзе і раёну ў суме 9.368.305 руб., або на 101,03 проц. Горад выканаў кантрольную лічбу на 9.006.990 руб., або 102,1 проц., у тым ліку па групе рабочых і служачых 103,3 проц. Па вёсцы кантрольнае заданьне выканана на 361.315 руб., або 79,9 проц., у тым ліку па групе калгасьнікаў 117,3 проц.

Ударнымі тэмпамі разьвіваньня новай пазыкі працоўныя Менску яшчэ раз даказалі сваю адданасьць партыі і прадэманстравалі сваю цьвёрдую волю пад сьцягамі Леніна, пад выпрабаваным кіраўніцтвам нашага правадыра тав. Сталіна змагацца за ажыцьцяўленьне задач другой пяцігодкі, за пабудову сацыялізму.

Вялізем далей работу па ахопу ўсіх працоўных гораду, калгасьнікаў і адноасобнікаў падпіскай на «пазыку другой пяцігодкі».

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) і правадыр нашай партыі і рабочай клясы т. Сталін!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з т. Гікало!

Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва!

Сакратар Менгаркому КП(б)Б КУДЗЕЛЬКА.
Нам. старшыні гарсавету КАРАНЕЎСКІ.
Старшыня Менгарпрафсавету ШУЛЬКІН.

### Па рабочым і служачым заданьне выканана

ЦК КП(б)Б, СНК БССР, ЦСПСБ, Наркамфіну БССР, рэд. „Зьвязда"

## РАПАРТ

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі, у выніку мабілізацыі рабочых мас Віцебшчыны, ЗАДАНЬНЕ ПА ПАЗЫЦЫ СЯРЭД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ у 4.200 тыс. рублёў выканана 19 мая а 10 гадз. увечары.

Узмацняем барацьбу па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы і сярод неарганізаванага насельніцтва.

Гарком КП(б)Б МІЦЬКОЎ.
Гарсавет КАРДАШЭНКА
Гарпрафсавет КРЫЖКЕВІЧ.
Рэдакцыя «Віцебскі пралетары» РОЗЭНБЛЮМ.

### ЦК КП(б)Б Гікало, СНК Галадзеду, ЦСПСБ Кавальчуку, Наркамфіну Хацкевічу, рэдакцыям „Зьвязда" і „Рабочий"

## РАПАРТ

Заданьне ў 4,3 млн. руб. па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых, ІТР і служачых 20 мая да 12 гадзін дня па Гомелю выканана ў суме 4.321.000 руб., ці на 100,5 проц. Рэалізацыя праводзіцца далей.

Старшыня Гарсавету РАЧЬІЦКІ.
Сакратар гаркому КП(б)Б ШАФАРЭНКА.
Старшыня гарпрафсавету ЭПШТЭЙН.

*Пятро Глебка*

## ГАЛАСУЕМ ЗА СТО

Дужасьць шырокіх твоіх плячэй,
Цьвёрдасьць маіх спрактыкованых рук,
Яркія сонцы твоіх вачэй,
Сэрца майго непадкуплены стук,
Усё,
Чым багаты і шчасны наш лёс,
І сіпу тваю
І мужнасьць маю —
Узгадаваў і праз бурь пранёс
Нашых рэспублік вялікі Саюз.

Рабочы Данбасу капаў руду,
Рабочы Масквы выробляў прадук,
Фэрганскі калгасьнік зьбіраў пахту,
Чароды авец гадаваў пастух,
Рабочы палеткаў вырошчваў хлеб,
Рабочы чыгункі яго вазіў...
І я перажыў дзевятнаццаць лет,
І ты перажыў дзевятнаццаць зім.
Бо нам пакрысе ад рэспублік усіх
Работнікі фабрык, зямлі і сяла
Нам перадалі часьцінку сіл,
Долю гарачай крыві і цяпла.

І я, узгадованы сілаю рук,
Што будавалі краіну маю,
Я падымаю й на плечы сёру
Штодзённай работы часьціну сваю

Ты таксама сумленна нясеш ля —
Вялікае працы маленькую дзель,
І долю работы тваё і мае
Мы вымяраем на цьвёрды рубель.

Наліты крамянасьцю нашых год
Ён дужасьці поўны, агню і цяпла,
І мы парашылі аддаць яго,
Каб наша краіна ярчэй цьвіла
І я кладу першы яго на стол,
І ты кладзеш першы яго на стол,
І я падымаю руку за сто,
І ты падымаеш руку за сто,
За сто поўнакроўных
Ад соткаў пазыкі
Другой пяцігодкі вялікай.

Няхай наша дужасьць шырокіх плячэй,
Няхай наша цьвёрдасьць упартых рук,
Няхай нашы сонцы праменных вачэй,
Няхай нашых пульсаў узгоднены стук,
Няхай наша сіла і наша кроў,
Што ў сэрцах няспынна гудуць і пяюць,
Няхай-жа бароняць і росьцяць скрозь
Нашых рэспублік Зьвязкі Саюз!

Лепшыя ўдарнікі аўта-рэмзаводу т. т. ВАЧАЙЦЫС І ЎРУБЛЕЎСКІ падпісаліся на пазыку на 150 проц. месячнага акладу (Маріноў).

### ЭНТУЗІЯСТ тав. ПАЎЛОЎСКІ

Першая зьмена рабочых — у поўным зборы. Адчыняецца мітынг. Абвешчаны вынікі розыгрышаў пазыкі «4-га завяршаючага». Камсамолія заводу рапартуе, што варашылаўцы маюць 68 выйгрышаў.

На трыбуне — прадстаўнік рабочых кацельнага цэху, які раней выступіў ад імя рабочых усяго цэху з папрабаваньнем аб выпуску пазыкі «Першага году другой пяцігодкі».

Выруць слова энтузіясты-старыкі, выступае моладзь. — Усе адзінаю масай падпісваюцца на новую пазыку і заклікаюць рабочых усяго заводу пасьледаваць іх прыкладу.

Заклік кацельнага цэху падхоплен усімі рабочымі заводу.

Пяцёрачнікі абяцяюць адзін аднаму спаборніцтва на хутчэйшае правядзеньне падпіскі на пазыку «Першага году другой пяцігодкі» — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Падпіска праведзена па-баявому — па-варашылаўску. Рабочыя самі выклікаюць, каб іх запісалі на месячны аклад і выклікалі іншых. — За дзве гадзіны стопроцантная падпіскай ахоплены рабочыя ўсяго заводу.

Калі ў часе правядзеньня рэалізацыі ранейшых пазык некаторыя рабочыя цягнуліся ў хвосьце, дык у падпісцы на пазыку «другой пяцігодкі» большасьць з іх — ініцыятары і арганізатары баявога правядзеньня падпіскі.

Падпісваюцца на месячны аклад. Выруць на буксір адстаючых.

Механічны і рамонтны цэхі заваявалі першынства па ўсім заводзе.

Беспартыйны рабочы — стары тав. ПАЎЛОЎСКІ, перадавік, арганізатар падпіскі. — Рамонтны цэх, у якім ён працуе, узяў тэмпы баявога правядзеньня падпіскі па ўсіх астатніх цэхах, сваім прыкладам і ініцыятывай.

І зараз ня любіць тав. Паўлоўскі, калі хто напамятне яму, што ў часе рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага» ён быў у ліку адстаючых.

Ён сёньня — другі чалавек.

Ён добра разумее, куды ідуць зродкі ад пазыкі. Ён сам сьвядомы ўдзельнік пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Тав. Паўлоўскі сваю сямёрку першы ахапіў стопроцантнай падпіскай.

Лепшых падпісчыкаў на пазыку Паўлоўскі тут-жа фатаграфуе.

На сьцяне заводу вісіць дошка гонару. Там фотакарткі лепшых падпісчыкаў, многіх рабочых-ударнікаў — арганізатараў падпіскі.

А такіх Паўлоўскіх па цэхах больш сотні. Такіх энтузіястаў завод налічвае больш сотні.

Непадалёку — сярод двара — стаіць дошка году падпіскі на пазыку. Зьверху на самалёце ляціць рамонтны цэх, які, маючы заданьне 15.848 рублёў, выканаў 18.445 рубл., што складае 113,4 проц.

Механічны цэх на заводзе таксама адзін з перадавых.

Падпісаўся ён на пазыку «Першага году другой пяцігодкі» на 105 проц.

На 17 мая па ўсім заводзе прачэдзена падпіска на 150.040 рублёў, што складае 111,75 проц.

Графік росту падпіскі з кожным днём расьце.

Кастусь Чыгір.

### Зрыўшчыкаў рабочага забесьпячэньня на сплаве—да адказнасьці

Полацкая сплаўкантора павінна сплавіць у гэтым годзе 47 куб. драўніны, 250 тыс. сьліпяроў, 15 тыс. куб. экспартнага лесаматар'ялу. Кантора ня дрэнна правяла падрыхтоўчую работу да сэзону (забесьпячэньне інвэнтаром, рабочай сілай і інш.), але зусім выпусьціла з-пад увагі важнейшае пытаньне барацьбы за творчую праграму—рабочае забесьпячэньне і грамадзкае харчаваньне.

Рабочае забесьпячэньне пастаўлена з рук вон дрэнна. Сплаўшчыкі вымушаны хадзіць за 10-12 кілёмэтраў, каб атрымаць прадукты. Плытагоны рэк Сосьніцы, Тураўлянкі ходзяць за атрыманьнем прадуктаў у Полацак, які знаходзіцца на адлегласьці 20 кіл. ад вучастку. Загадчык вучастку тав. Рабейчык ня прыняў ніякіх мер, каб паладзіць выдачу прадуктаў рабочым на месцы іх работ.

Наглядаюцца значныя перабоі ў выдачы прадуктаў, асабліва на Полацкім і Гаранскім вучастках. Для Полацкага вучастку даўно атрыманы прадукты, між тым яны ляжаць на складзе ў Віцебску. Кіраўнікі вучастку ня турбуюцца, каб хутчэй завезьці гэтыя прадукты на вучастак і забясьпечыць рабочых пайкамі.

Яшчэ горшае становішча на Гаранскім вучастку. Тут рабочае снабжэньне зусім абязьлічана. Загадчык тав. Віхман і яго памочнік Раўдольс ня лічаць сваім абавязкам займацца гэтым важнейшым пытаньнем. Такая пастаноўка работы прывяла да таго, што 26-га красавіка адпраўлен быў 1-шы караван са сьліпярамі. Плытагоны ў колькасьці 43 чалавек вымушаны былі плысьці, не атрымаўшы прадуктаў.

Гэтымі днямі на Гаранскі вучастак прывезена брыгада плытагонаў з другога раёну ў колькасьці 35 чалавек. Аднак і да сёньняшняга дня кіраўнікі вучастку ня могуць паладзіць работу мэтр ад вучастку ёсьць сталоўка, абеды-ж на вучастак не падвозяцца. Загадчык вучастку тав. Віхман тлумачыць гэта тым, што няма каня для падвозкі абедаў.

Дрэнна арганізавана работа па асобных вучастках. Гэта перш за ўсё выяўляецца ў адсутнасьці барацьбы за працоўную дысцыпліну. Ня так даўно дзесятнік Казіміраў самавольна кінуў работу, і не атрымаў за гэта ніякага спагнаньня. Кіраўнікі вучастку Гараны тав. Віхман і Леусгольц ня былі на вучастку каля дожаў і на гэта сплаўкантора не зьвярнула ўвагі.

На Гаранскім вучастку яшчэ не даведзены заданьні да некаторых брыгад. Ня складзены месячныя і падэкадныя каляндарныя пляны.

Вучасткі: Гараны, Віцебск і Старае сяло павінны сплавіць 430 тысяч сьліпяроў, але і да гэтага часу ні адзін з гэтых вучасткаў ня ведае, колькі яму трэба сплавіць іх.

У Гаранах ёсьць кантора экспартлесу, якая ведае падвозкай сьліпяроў са станцыі да рэчак. Тут работа таксама арганізавана дрэнна. Праз некалькі дзён сьліпяроў ня будзе ўжо на берагох рэк, у той час як станцыя празьмерна загружана імі. Кантора экспартлесу не патурбавалася нават прыняць сьліпяры і арганізаваць хутчэйшую падвозку іх да рэк.

Плытагоны недастаткова забясьпечаны кватэрай. Такія пункты, як Гараны, Полацак, Стоўпі, Западлес ня маюць баракаў для рабочых плытагонаў. Кіраўнікі вучасткаў тлумачаць гэта адсутнасьцю грошай для будаўніцтва, у той час як на пабудову баракаў патрабуецца вусім нязначная сума.

Пытаньнем рабочага забесьпячэньня

*САЎКОЎ*

## БАЯВЫ ЭКЗАМЭН

Менскі раён выканаў заданьне на працягу 5 дзён больш чым на 100 проц. Аб аналёгічных выніках гаворыць весткі і з іншых гарадоў і раёнаў. Гэты факт зьяўляецца выразным паказальнікам узрастаючай папулярнасьці праграмы сацыялістычнага будаўніцтва і адданасьці шырокіх мас працоўных генэральнай лініі нашай партыі.

Набываючы, з вялікім уздымам энтузіязму і энэргіі, аблігацыі даяржаўных пазык, працоўныя масы ведаюць, што яны выйграюць. Галоўны выйгрыш — вынікі першай пяцігодкі. Працоўныя масы ўпэўнены, што вынікі другой пяцігодкі будуць яшчэ большым выйгрышам па іх аблігацыях.

Толькі чалавек, які ня бачыць нічога далей свайго носа, ня можа ўяўіць сабе таго, што ў выніку ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі Беларусь, былая адсталая акраіна капіталістычнай Расіі, зараз ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну—краіну буйных фабрык і заводаў, буйнага сацыялістычнага зямляробства, краіну, якая налічвае 36 новых буйных прадпрыемстваў, як Гомсельмаш, Белдрэс імя Сталіна, дрэваапрацоўчы камбінат (Бабруйск), магілёўская фабрыка шкуўнага шоўку і інш.

Зараз на палёх 429 саўгасаў і 8.910 калгасаў БССР працуюць 2,5 тыс. трактараў, аб'яднаных у 57 МТС. 32 вышэйшыя навучальныя ўстановы, 130 тэхнікумаў, вялікая сетка навукова-дасьледчых устаноў на чале з Беларускай Акадэміяй Навук, — вось вынікі першай пяцігодкі.

Гэтыя вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва дасягнуты працоўнымі за свой уласны пралетарскі кошт, «без кабальных крэдытаў і пазык звонку» (Сталін).

Сродкі на патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва працоўныя масы даюць пралетарскай дзяржаве праз пазыкі і ашчадкасы, прычым даюць нават значалася ў БССР атрымаць праз пазыкі 60 млн. руб., дык працоўныя масы ў сустрэчным парадку далі 113 млн. Гэтыя лічбы, разам з аналёгічнымі паказальнікамі рэалізацыі пазык па СССР, кажуць, што Савецкі саюз, які пераможна скончыў пабудову фундаманту сацыялізму і прыступіў да пабудовы бясклясавага грамадзтва, мае вялізарныя пэрспэктывы для далейшага разьвіцьця даяржаўнага крэдыту, які апіраецца на найпрыяцільнейшыя шматмільённыя масы працоўных.

Посьпехі першых дзён па рэалізацыі новай пазыкі ні ў якім разе не павінны, аднак, усыпляць нашай клясавай пільнасьці як у самой рабоце па рэалізацыі, так, і асабліва, па абслугоўваньні пазыкатрымальнікаў. Узорнае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў зьяўляецца цэнтральнай задачай усяго фінансава-крэдытнага апарату і ўсёй грамадзкасьці.

Нельга ні на адну хвіліну забываць пра клясавага ворага, які ўсямерна імкнецца перашкодзіць у мабілізацыі сродкаў насельніцтва на патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва, бо кожны даны працоўнымі ў пазыку даяржаве рубель набліжае клясавага ворага да нямінучай пагібелі.

Добрае абслугоўваньне 40-мільённай арміі пазыкатрымальнікаў будзе лепшым агітатарам за нашу пазыку. Часамі клясавы вораг, прылезшы ў сыстэму ашчадных кас, непасрэдна сам і праз сваю агентуру імкнецца заблытаць справаздачасьць па пазыках, затрымаць нерагзаныя аблігацыі, ня выплаціць выйгрышу, завесьці цёганіну і г. д. Такіх зьявішч у ашчадных касах яшчэ шмат. Гэта абавязвае ўсю грамадзкасьць дэтальна праверыць апарат ашчадных кас, ачысьціць яго ад чужога элементу, умацаваць адзьнымі, адданымі інтарэсам рабочай клясы мі, адданымі інтарэсам рабочай клясы, і ўзяць яго работу пад непасрэдны кантроль працоўных мас.

На працягу апошніх месяцаў выяўлены адносін з боку работнікаў ашчадных кас да абслугоўваньня пазыкатрымальніка. Праўда, пінаватыя атрымалі жорстка на заслугах, але-ж мы яшчэ на кожным кроку сустракаемся з гэтымі агідна-недапушчальнымі адносінамі і зараз.

Праведзены ў БССР дзень пазыкатрымальніка даў вялікія вынікі. За час яго выяўлена 153 тыс. выйгрышаў, па якіх выплачана больш 1 млн. руб. грошай. Зразумела, гэтыя вынікі нельга лічыць здавальняючымі, паколькі ў радзе раёнаў (Асіпавіцкім, Талачынскім, Прапойскім, Карманскім, Бярэзінскім, Чэрвеньскім, Цярахоўскім, Уваравіцкім, Горацкім, Рэчыцкім, Нараўлянскім і інш.) дзень пазыкатрымальніка быў правален. Кіраўніцтва гэтых раёнаў недаацаніла палітычнай важнасьці гэтай работы і падыйшло фармальна да вырашэньня гэтага важнейшага пытаньня. Фармальна падыйшлі да гэтай справы і на фабрыцы «8 сакавіка» ў Менску, дзе пасьля дня пазыкатрымальніка, за першыя два дні ў часе рэалізацыі пазыкі 2-й пяцігодкі выяўлена 75 выйгрышаў па ранейшых аблігацыях, па якіх на месцы выплачана 2.400 руб.

Рэалізацыя новай пазыкі павінна ісьці разам з работай па выяўленьні і выплаце выйгрышаў. За час рэалізацыі неабходна закончыць суцэльную праверку і выплату выйгрышаў па аблігацыях ранейшых пазык.

Для таго, каб з посьпехам скончыць рэалізацыю новай пазыкі, мы павінны палепшыць абслугоўваньне пазыкатрымальніка, давесьці да кожнага падпісчыка выгады нашых масавых пазык. Між тым, у радзе раёнаў (Смалявіцкім, Дуброўна, Гарадок, Уваравічы і інш.), якія сыстэматычна правальваюць выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў і рэалізацыю пазык, яшчэ і на сёньня дазваляюцца разважаньні, што ніхто для рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі яшчэ хопіць, яшчэ не наступіла чарга кампаніі па рэалізацыі пазыкі, бо трэба канчаць сяўбу.

Правал выкананьня заданьня тлумачыцца толькі тым, што кіраўніцтва гэтых раёнаў зводзіла недаацэньненае пытаньні мабілізацыі сродкаў і ігнаруе ваннні гэтай работы. Чарговасьць кампаніі — вось адна з галоўных прычын правалу ўказанымі раёнамі рэалізацыі пазыкі «4 завяршаючага». Гэта чарговасьць ставіць пад пагрозу срыву і правядзеньне кампаніі па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі у гэтых раёнах.

Падобным настроям павінна быць дан самы рашучы адпор. Работа па рэалізацыі павінна быць цесна ўвязана з веснавой сяўбой і праводзіцца адначасова і ў горадзе і ў вёсцы. Прычым горад у парадку шэфскай работы павінен адыграць рашаючую ролю ў справе рэалізацыі пазыкі ў саўгасах, калгасах і сельскіх саветах, якія ў большасьці яшчэ не прыступілі да правядзеньня гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

Работа па рэалізацыі пазыкі павінна праводзіцца на падставе поўнай добраахвотнасьці. Між тым, мы ўжо маем сыгналы аб перагібах у Пухавіцкім раёне, які даводзіць да кожнай гаспадарчай кантрольныя лічбы ў парадку цьвёрдага заданьня. Прычым кожнаму калгасьніку вызначаецца сума 18 руб. і кожнаму аднаасобнаму двару па 35

Цэнтральны і некаторыя мясцовыя газэты актыўна ўключыліся ў кампанію і арганізуюць масы на пасьпяховае завяршэньне рэалізацыі. Разам з гэтым ёсьць раённыя газэты, якія злачынна адносяцца да гэтай важнейшай справы. Напрыклад, рэдактар смалявіцкай раённай газэты адмовіўся зьмясьціць пастанову ўраду аб пазыцы другой пяцігодкі. Газэты «Сацыялістычны шлях» (Крычаў), «Калгасьнік Вузьдзеншчыны», «Калгасны сьцяг» (Копыль), «Прымежны камунар» (Жыткавічы) і г. д. 13 і 14 мая, калі працоўныя патрабавалі выпуску пазыкі, на сваіх старонках не абмовіліся ні словам аб пазыцы, і пазыкатрымальніках. Гэтыя газэты, як відаць, любяць фінансы толькі тады, калі на чэках атымліваюць грошы, а рэшта іх быццам і не датычыць. Палітычная блізарукасьць кіраўнікоў гэтых газэт патрабуе ад мясцовых арганізацый неадкладных рашучых мер.

Ашчадны апарат у рэалізацыі новай пазыкі трымае балы экзамэн, у часе якога паказаць сваю здольнасьць у будаўніцтве сацыялізму. Гэты экзамэн апарат павінен вытрымаць з гонарам. Гэта, аднак, ён зможа зрабіць толькі тады, калі яму будзе аказана мясцовымі арганізацыямі адпаведная дапамога.

Ужо час спыніць пераварэньне ашчадкас у праходны двор для разэрвовых работнікаў. Выконваць вялізарную задачу па мабілізацыі дробных і драбнейшых зьбераж еньняў насельніцтва на патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва немагчыма, калі на працягу 4-х месяцаў з 75 загадчыкаў райашчадкас 43 зьмяняліся. Шэраг раёнаў (Ворша, Гарадок, Буда-Кашалёў і г. д.) справу зьмены загадчыкаў ашчадкас працягваюць і зараз, ня гледзячы на адпаведныя дырэктывы кіруючых органаў і кампанію па рэалізацыі пазыкі, якая зараз праходзіць.

У некаторых раёнах загадчыкі ашчадкас толькі па 30 дзён у годзе бываюць на сваёй непасрэднай рабоце, прычым тады, калі зьмяняюць бялізну, а астатні час працуюць на іншых работах, у сельсаветах. Такія факты мы маем у Сеньненскім, Сіроцінскім, Гарадоцкім, Смалявіцкім, Чачэрскім, Веткаўскім і інш. раёнах, якраз у тых раёнах, дзе апарат ашчадкасы засьмечан клясава-варожымі элементамі, якія, скарыстоўваючы бяспрытульнасьць ашчадкас, творацъ там свае злачынныя справы над пазыкатрымальнікамі і ўкладчыкамі ашчадкас і тым самым адштурхоўваюць тысячы працоўных аддачы сваіх зьбераж еньняў на патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва.

Кампанія па рэалізацыі пазыкі павінна актывізаваць шырокія працоўныя масы на барацьбу за фінплян. Яна павінна ўдзесяцярыць шэраг ударнікаў фінансавага фронту і ўцягнуць у фінансавую работу шырокія працоўныя масы.

Ажыцьцяўленьне гэтых задач забясьпечыць перамогу ў рэалізацыі новай пазыкі, забясьпечыць бесьперабойнае фінансаваньне другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага грамадзтва — і напясе жорсткі ўдар па кулаку і іншым агентам.

## ПА ШПАЛЬТАХ ГАЗЭТ СССР

### Новыя крыніцы нафты

Азнафта разгарнула вялікія работы ў новым нафтавым раёне—КАЛА. У маі там сьвідруюць 20 эксплёватацыйна-разьведачных сьвідравін.

Новы промысел узмоцнен 20 лепшымі сьвідроўшчыкамі і радам інжынэрна-тэхнічных работнікаў. У другім квартале будзе скончана пабудова двух шасэйных дарог і адкрыт аўтобусны рух. Праведзена газавая магістраль, якая злучае Калу з промыслам імя Арджанікідзэ. Будуецца мэханічная майстэрня, інтэрнат на 150 чалавек, сталоўна на 500 чалавек.

У 1934 годзе Кала будзе адным з перадавых прамысловых раёнаў («БАКИНСКИЙ РАБОЧИЙ»).

### Зьезд ударнікаў калгасаў Дагестану

Да 10-га мая Дагестан перавыканаў пасеўны плян. У гэтым годзе пасеўная плошча перавышае леташнюю на 20 тыс. га. У радзе калгасаў нормы высева і сяўбы перавыконваліся на 25 проц. У розьніц сяўбы ў калгасы Дагестану ўвайшло звыш 5.000 аднаасобных гаспадарак. 1-га чэрвеня скліканы ца дагестанскі зьезд ударнікаў калгасаў, МТС і саўгасаў, на якім будуць падведзены вынікі сяўбы. На зьезд прыбудуць 300 лепшых ударнікаў. Сацыябарніцтва на атрыманьне мандату дэлегата выклікала вялікі ўздым вытворчага энтузіязму ў калгасах вобласьці. («МОЛОТ»).

### Перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі

Канчаецца друкам першы армяна-курдзкі слоўнік, які выпускаецца Дзяржвыдавецтвам Арменіі. Слоўнік уключае да 13 тыс. слоў. Дзяржвыдавецтва прыступіла таксама да выпуску стабільных падручнікаў на курдзкай мове для курдзкіх школ. («ЗАРЯ ВОСТОКА»).

### Новы вучастак па падземнай газафікацыі вугалёў

Камісія Наркамцяжпраму зацьвердзіла праект падрыхтоўкі новага вопытнага вучастку па газафікацыі вугалёў на Крутаўскай капальні. Падмаскоўнага басэйну. Вопыты будуць праводзіцца па мэтаду прафэсара Фёдарава. Падрыхтоўка вучастку скончыцца праз два месяцы.

Новы вопытны вучастак Падмаскоўнага басэйну значна больш першага і дае магчымасьць шырока разгарнуць работы па газафікацыі. Камісія Наркамцяжпраму пастанавіла таксама правесьці падземную газафікацыю вугалёў на чалябінскіх капальнях Уралвугалю. («ЗА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИЮ»)

### Няма такой машыны, якую-б не маглі зрабіць у СССР

Дзякуючы вялікім посьпехам прамысловасьці СССР у асваеньні перадавой тэхнікі, Наркамцяжпраму ўдалося ў гэтым годзе зьняць з імпарту абсталяваньня для прамысловасьці на 15,1 млн. руб. золатам. У гэтым годзе будзе выпушчана ўнутры краіны машын, зьнятых з імпарту, на 6,2 млн. руб. золатам, у будучым годзе—на 8,9 млн.

Тэхнічная база савецкага машынабудаўніцтва дазваляе адмовіцца ад увозу раду самых складаных машын і агрэгатаў (пракатныя станы, мэталяргічныя варштаты, турбапаветрадуўкі, турбакампрэсары, вялікія помпы, буйныя млыкы і інш.). Усе гэтыя машыны могуць быць сканструяваны нашымі тэхнічнымі сіламі і выраблены на савецкіх заводах. («СОВХОЗНАЯ ГАЗЕТА»).

### Будуецца ўсеўкраінскі фізкульт турны камбінат

У Харкаве будуецца зараз усеўкраінскі камбінат фізкультуры імя Пятроўскага. Цэнтральныя трыбуны камбінату зьмесьцяць звыш 70 тыс. гледачоў. На полі масавай фізкультуры адначасова могуць разьмясьці

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# ШЫРОКА РАЗГОРНЕМ ПАДРЫХТОУКУ ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

## ПРАВЯДЗЕМ ЧЫСТКУ НА АСНОВЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ, СЬЛЕДУЮЧЫ ЎКАЗАНЬНЯМ ЛЕНІНА: „БОЛЬШ АГЛАСКІ, ГРАМАДЗКАЙ КРЫТЫКІ, ВЫТРУЧВАНЬНЯ НЯГОДНАГА, ПРЫЗЫВУ ВУЧЫЦЦА Ў ДОБРАГА“

## *Інструкцыя абласным, раённым і нізавым камісіям па чыстцы партыі*

На падставе пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 28 красавіка 1933 г. аб чыстцы, Цэнтральная Камісія па чыстцы прапануе ўсім партыйным арганізацыям кіравацца наступнымі ўказаньнямі:

### I. Аб камісіях па чыстцы

1. Краявыя (абласныя, рэспубліканскія) камісіі па чыстцы назначаюць раённыя камісіі па чыстцы, кіруюць іх работай, даюць растлумачэньні і парады ў працэсе чысткі і разглядаюць скаргі на рашэньні раённых камісій.

2. Раённыя камісіі па чыстцы арганізуюцца ў складзе трох членаў як для гарадзкіх раёнаў, так і для сельскіх раёнаў.

3. У тых раёнах, дзе колькасьць членаў партыі не перавышае 500 чалавек, чыстка праводзіцца непасрэдна раённымі камісіямі. Там-жа, дзе колькасьць членаў партыі перавышае 500 чалавек, раённыя камісіі стваралі ячэйковыя камісіі ў складзе трох членаў з тым, каб кожная ячэйковая камісія ахапляла ня менш 1.000 членаў і кандыдатаў партыі. Старшыні ячэйковых камісій зацьвярджаюцца абласнымі камісіямі.

4. На буйных прадпрыемствах, якія маюць 2.000 і больш членаў і кандыдатаў партыі і аб'ядноўваюць рад цэхавых ячэек, абласныя камісіі па чыстцы ствараюць агульна-заводзкія камісіі па чыстцы з усім правамі раённых камісій. Агульна-гарадзкім камісіям даецца права ствараць цэхавыя ячэйковыя камісіі, старшыні якіх зацьвярджаюцца абласнымі камісіямі.

5. Камісіі па чыстцы (абласныя, раённыя, ячэйковыя) маюць права выносіць рашэньні аб выключэньні з партыі, аб пераводзе з членаў партыі ў кандыдаты і аб пераводзе з кандыдатаў у спачуваючыя. Камісіі не вырашаюць пытаньня аб зьняцьці з работы або аб пераводзе з аднэй работы на другую.

6. У склад ячэйковых камісій па чыстцы падбіраюцца аўтарытэтныя, палітычна пісьменныя і вытрыманыя, ня быўшыя раней у іншых партыях, ня быўшыя ў апазыцыі члены партыі з партыйным стажам ня менш 7 год.

7. Члены раённых камісій па чыстцы, перш чым прыступіць да работы па чыстцы, абавязаны самі прайсьці чыстку на адкрытых сходах сваіх ячэек, якая праводзіцца членамі абласных камісій, таксама як члены ячэйковых камісій яшчэ да чысткі павінны прайсьці чыстку на адкрытых сходах сваіх ячэек, якая праводзіцца членамі раённых камісій.

8. Камісіі па чыстцы маюць права прыцягваць сабе ў дапамогу членаў партыі для выкананьня асобных даручэньняў як па абсьледваньні ячэек у цэлым, так і па праверцы вестак аб асобных партыйцах, што праходзяць чыстку.

9. Цэнтральная камісія зварачае ўвагу ўсіх абласных камісій і ўсіх партыйных арганізацый, што рашаючай умовай у справе пасьпяховага правядзеньня чысткі партыі зьяўляецца старанны і высокаякасны падбор як членаў раённых і ячэйковых камісій па чыстцы, так і асабліва іх старшынь. Папярэднім адборам і вывучэньнем членаў камісій па чыстцы павінны займацца **асабіста** старшыні абласных і раённых камісій па чыстцы пры актыўнай дапамозе сакратароў партыйных камітэтаў і старшынь КК. Абласныя і раённыя камісіі не павінны зацьвярджаць ні аднаго члена раённых і ячэйковых камісій без папярэдняга азнаямленьня і асабістай гутаркі з зацьвярджаемымі членамі абласной або раённай камісіі.

### II. Арганізацыя чысткі

10. Раённыя камісіі па чыстцы ўстанаўляюць: чарговасьць і тэрміны чысткі па ячэйках, колькасьць і тэрміны арганізацыі ячэйковых камісій па чыстцы па пэўных ячэйках.

11. Усе партыйныя ячэйкі павінны правесьці ў сябе да пачатку чысткі шырокую растлумачальную работу аб задачах чысткі і падрыхтаваць усе матар'ялы, характарызуючыя членаў сваіх ячэек, у прыватнасьці, матар'ялы аб праступках і партспагнаньнях, якім падлялі члены даных ячэек.

12. На сходы ячэек, прысьвечаныя чыстцы, павінны шырока прыцягвацца беспартыйныя рабочыя, працоўныя сялане і служачыя тых прадпрыемстваў і устаноў, саўгасаў і калгасаў, члены ячэек якіх праходзяць чыстку.

13. Кожны камуніст праходзіць чыстку ў тэй ячэйцы, дзе ён плоціць членскія ўзносы і знаходзіцца на пастаянным вучоце (дзе знаходзіцца яго вучотная картка). Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў партыі па выклику камісіі па чыстцы абавязкова. Калі член ці кандыдат партыі па ўважлівых прычынах (камандыроўка, хвароба і г. д.) ня можа зьявіцца да вызначанага тэрміну для прахаджэньня чысткі, ён павінен быць праверан асобна камісіяй па чыстцы пасьля яго звароту на месца работы.

14. Кожны член партыі і кандыдат паведамляюць камісіі па чыстцы кароткую аўтабіяграфію і весткі аб сваёй працы ў мінулым і цяпер.

15. Па сканчэньні ўсёй работы па чыстцы ячэйкі ячэйковая камісія па чыстцы робіць паведамленьне аб прынятых ёю рашэньнях у адносінах прайшоўшых чыстку камуністаў на агульным сходзе ячэйкі і паведамляе апэшку стану і работы ячэйкі, а таксама вывады камісіі аб выпраўленьні недахопаў.

16. Пасьля правядзеньня заключнага сходу ў ячэйцы, ячэйковая камісія па чыстцы прадстаўляе раённай камісіі па чыстцы пісьмовую справаздачу аб рэзультатах сваёй работы па кожнай ячэйцы ў пасобку, а таксама прадстаўляе па зацьвярджэньне раённай камісіі свае рашэньні аб выключэньнях з партыі, пераводах у кандыдаты і спачуваючыя.

17. Рашэньні ячэйковых камісій па чыстцы аб выключэньнях з партыі, пераводах у кандыдаты і спачуваючыя павінны быць дакладна ўгрунтаваны. Трэба коратка, але дакладна ўказаць, якімі фактамі даказана абвінавачаньне і даваемая адмоўная характарыстыка. Да пратаколу павінны быць прыкладзены дакументы, якія пацьвярджаюць занесеныя ў пратакол абвінавачаньне і адмоўныя характарыстыкі, а ў выпадку адсутнасьці такіх дакументаў павінна быць указана, з чыіх слоў запісана абвінавачаньне і кім і як яно праверана. Аб членах і кандыдатах партыі, выключаных або пераведзеных у спачуваючыя, павінны быць паведамлены асноўныя анкетныя весткі (партыйны стаж, узрост, сацыяльнае паходжаньне, адукацыя, выконваемая работа ў моманты чысткі, тэрмін прабываньня ў Чырвонай арміі, ці служыў у белай арміі, па мабілізацыі ці добраахвотна, чым займаўся да 1917 году, ці належаў да іншых партый і на працягу якога тэрміну, ці быў у апазыцыі, ці прымаў удзел у фракцыйнай рабоце, ці прыцягваўся да партыйнай адказнасьці, чым займаўся ў апошнія 2-3 гады), а таксама даныя аб удзеле члена партыі або кандыдата ў партыйнай і грамадзкай рабоце.

18. Усе членскія білеты і кандыдацкія карткі праверяюцца з пункту гледжаньня правільнасьці занесеных у іх вестак. Членскі білет і кандыдацкая картка адбіраюцца ў тых камуністаў, выключэньне якіх з партыі зацьверджана раённай камісіяй па чыстцы. Пераведзены ў спачуваючыя атрымлівае картку спачуваючага.

### III. Аб парадку зацьвярджэньня і абскарджаньня рашэньняў камісій па чыстцы

19. Кожны член партыі або кандыдат, атрымаўшы партыйнае спагнаньне (выключэньне з партыі, перавод у кандыдаты і спачуваючыя), мае права абскардзіць рашэньне ячэйковай камісіі па чыстцы ў месячны тэрмін у раённую камісію. У выпадку, калі даны член партыі або кандыдат не задаволен рашэньнем раённай камісіі, ён абскардзіць яго ў краявую (абласную, рэспубліканскую) камісію па чыстцы, рашэньне краявой (абласной, рэспубліканскай) камісіі па чыстцы ў сваю чаргу — у Цэнтральную Камісію па чыстцы і рашэньне Цэнтральнай Камісіі — XVII зьезду УсеКП(б), як вышэйшаму органу партыі. Апэляцыі ў абласныя і цэнтральную камісіі павінны быць паданы не пазьней дня абвяшчэньня аб скліканьні XVII зьезду УсеКП(б).

20. Камісіі па чыстцы абавязаны абскарджаньне выключаных пры чыстцы з усімі справамі аб чыстцы і ўсімі матар'яламі аб даных таварышох неадкладна пераслаць у вышэйшую камісію па чыстцы, куды накіроўваецца данае абскарджаньне.

21. Рашэньне ячэйковых камісій па чыстцы аб выключэньні з партыі і пераводзе ў кандыдаты і спачуваючыя ўваходзіць у сілу з моманту зацьвярджэньня іх раённымі камісіямі па чыстцы. Пасьля рашэньня раённай камісіі па чыстцы выключаны траціць свае правы члена або кандыдата партыі, нягледзячы на тое, што гэта рашэньне ня будзе скасавана вышэйстаячай камісіяй па чыстцы.

22. Зацьвярджаючы пратаколы ячэйковых камісій па чыстцы, раённыя камісіі могуць ставіць на перагляд іх рашэньні аб выключэньні тых ці іншых членаў партыі, незалежна ад паяўнасьці або адсутнасьці абскарджаньня, калі гэтыя рашэньні недаволі ўгрунтаваны, або калі чысткі была праведзена з парушэньнем пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы і даной інструкцыі. Перагляд справы ў гэтым выпадку праводзіцца абавязкова ў прысутнасьці старшыні або члена ячэйковай камісіі па чыстцы і чалавека, выключанага з партыі. Разгляд абскарджаньняў на пастановы раённых камісій па чыстцы ў краявых (абласных, рэспубліканскіх) камісіях па чыстцы адбываецца ў прысутнасьці апэлюючага або шляхам выезду на месцы.

23. У выпадку пятнаццаці камісій па чыстцы з адменай яе пастановы вышэйстаячай камісіяй, яна мае права абскардзіць рашэньне апошняй у вышэйстаячую камісію (ячэйковая камісія абскарджвае рашэньні раённай — у краявую, раённая рашэньні краявой — у цэнтральную).

### Аб складзе абласных і краявых камісій па чыстцы партыі

Назначыць абласныя і краявыя камісіі па чыстцы ў складзе наступных таварышоў:

**1. Маскоўская вобласьць**

**Старшыня — КНОРЫН В. Г.** — член ЦК УсеКП(б).

**Члены камісіі: ПЭТЭРС Я. Х.** — член прэзыдыуму ЦКК і старшыня МАКК;

**ФІЛАТАЎ Н. А.** — старшыня Маскоўскай гарКК;

**КАРАВАЕЎ П. Н.** — член ЦКК і сакратар п.-к. аблКК;

**СОЛЦ А. А.** — член прэзыдыуму ЦКК.

**2. Ленінградская вобласьць**

**Старшыня ШКІРАТАЎ М. Ф.**—член прэзыдыуму ЦКК.

**Члены камісіі: ШАСТАКОЎ В. І.** — старшыня Ленінградзкай аблКК;

**БАГДАНАЎ М. В.** — член ЦКК і старшыня Ленінгр. гарКК;

**КІСЯЛЕЎ Ю. А.** — сакратар партколегіі гарКК;

**ПЯТРОЎСКІ А. Н.** — старшыня Ленінградзкага абласнога саюзу агульнага машынабудаўніцтва, член Ленінградзкага абкому УсеКП(б), член УсеКП(б) з 1908 г.

**3. Уральская вобласьць**

**Старшыня — РОЙЗЭНМАН Б. А.** — член прэзыдыуму ЦКК.

**Члены камісіі: МАРКУС Ф. М.** — старшыня уральскай аблКК;

**АСЬМОЎ Н. М.** — член прэзыдыуму ЦКК.

**4. Беларусь**

**Старшыня АНЦІПАЎ Н. К.** — член ЦК УсеКП(б).

**Члены камісіі — САХАРАВА П. Ф.** — член партколегіі ЦКК;

**ЛЫЧОЎ І. А.** — старшыня ЦКК КП(б)Б.

**5. Усходня-Сібірскі край**

**Старшыня КАРАТКОЎ І. І.** — член прэзыдыуму ЦКК.

**Члены камісіі: САВОСЬЦІН Д. І.** — член ЦКК і старшыня Усходня-Сібірскай крайКК;

**ГЕМЗЭРЭЗРТ М.** — член ЦКК.

**6. Далёка-Усходні край**

**Старшыня — АНЦЭЛОВІЧ Н. М.** — кандыдат у члены ЦК УсеКП(б).

**Члены камісіі: КОПТЕЎ А. К.**—член ЦКК і старшыня Далёка-Усходняй крайКК;

**АРАНШТАМ Г. Н.** — член ЦКК.

**7. Адэская вобласьць**

**Старшыня — СУХАМЛІН К. В.** — кандыдат у члены ЦК УсеКП(б) і старшыня ЦКК КП(б)У.

**Члены камісіі: БАНКОВІЧ Я. М.** — старшыня Адэскай аблКК; **КАКОВІХІН Б. Н.** — член ЦКК.

**8. Данецкая вобласьць**

**Старшыня — ШВЭРНІК Н. М.** — член ЦК УсеКП(б) і сакратар УсеЦСПС.

**Члены камісіі: ПЕРАКАТАЎ І. Г.** — член ЦКК і старшыня Данецкай аблКК;

**НАЗАРАЎ С. І.** — член ЦКК.

**9. Кіеўская вобласьць**

**Старшыня — МАНУІЛЬСКІ Д. З.**— член ЦКК УсеКП(б).

**Члены камісіі: МАКАРАЎ Т. Г.** — старшыня Кіеўскай аблКК;

**КРЫВАЎ Т. С.** — член прэзыдыуму ЦКК.

**10. Віньніцкая вобласьць**

**Старшыня — ЧУВЫРЫН П. Е.** — член ЦК УсеКП(б) і старшыня ВУСПС.

**Члены камісіі: СЬПІВАК І. С.** — старшыня Віньніцкай аблКК;

**ТРЫЛІСЭР М. А.** — член ЦКК.

Прапанаваць абласным і краявым камісіям пачаць чыстку з 1 чэрвеня 1933 году.

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ УсеКП(б) ПА ЧЫСТЦЫ.**

## На чале багушэўскай ячэйкі—шляпы

ВОРША, (Ад нашай брыгады).

У Багушэўскім сельсавеце—адна з буйнейшых партыйных ячэек раёну. У ёй налічваецца 14 камуністаў, з якіх 6 працуюць непасрэдна ў калгасах.

Як-жа гэта арганізацыя змагалася за тэмпы і якасьць сяўбы? З фармальнага боку як быццам усё стаіць добра. У ячэйцы няма ні аднаго камуніста, які-б ня быў прымацован да пэўнай брыгады ці калгасу, які-б не адказваў за канкрэтны вучастак калгаснай вытворчасьці. Але гэта толькі фармальна. У сапраўднасьці-ж мы маем зусім адваротнае.

Аб гэтым вельмі выразна паказаў агульны сход ячэйкі, прысьвечаны абмеркаваньню пытаньня аб надыходзячай чысткі партыі.

У Багушэўскім сельсавеце сяўба пра ходзіць вельмі марудна. Амаль ва ўсіх калгасах існуюць купацка-дзедаўскія традыцыі—сеяць пад «духа». І гэта невыпадкова. Такое становішча ў сельсавеце ёсьць перш за ўсё рэзультат бязьдзейнасьці партыйнай ячэйкі, рэзультат таго, што на чале яе да гэтага часу стаяць не камуністы, а шляпы.

Дамо слова фактам. У калгасе «Расьсьвет» зрываецца сяўба, калгасьнікі на работу выходзяць у 8-9 гадзін, а старшыня калгасу СТРЫК яшчэ пазьней. У гэтай гаспадарцы да мінімуму зьніжаны нормы выпрацоўкі (па ворыву 0,25 га на плуг).

Да гэтага калгасу прымацован член бюро Багушэўскай ячэйкі т. ІГНАЦЮК, які палец аб палец ня ўдарыў, каб выкрыць і разьбіць у «Расьсьвеце» кулацкія тэндэнцыі. Яго «работа» ў калгасе заключалася ў тым, каб прыйсьці да старшыні калгасу і папрасіць:

—Слухай, братка, сей, зрабі пасну.

А калі Стрык спасылаўся на «аб'ектыўныя прычыны», Ігнацюк бездапаможна замаўкаў і зьбянтэжаны вярочаўся да дому.

Прыкладна такую-ж «работу» ў калгасе «Шлях да сацыялізму» праводзіў член партыі, дырэктар фабрыкі гнутай мэблі т. ЕГУДАСМАН. Яго дзейнасьць абмяжоўвалася тым, што ён прыходзіў у сельсавет, у ячэйку і самэнадзейна заяўляў:

— Аспабанеце мяне на 10 дзён ад маёй непасрэднай работы, тады я бязумоўна забясьпечу ў калгасе пералом...

А між тым у «Шляху да сацыялізму» адбываецца нячуваны сабатаж сяўбы. Нам давялося быць сьведкамі ў гэтым калгасе ранішняй нарады. Вось яе «зьмест»: У 8 гадзін раніцы ў калгасе было ціха. І не таму, што ўсе разышліся на работу, а таму, што калгасьнікі на чале са сваім старшынёй РЫБАКОВЫМ Паўлам сабраліся ў хату і абмяркоўвалі пытаньне:

—Ці ісьці, ці ня ісьці на работу, бо бачыце, быў дождж—учора...

—Яно-б можна было і ня ісьці, але-ж бяда наша, што ад упаўнаважанага з раёну строгі наказ быў, каб рана сеяць..

—А хіба-ж можна сеяць у грязь?—уторыць яму палявод Рыбакоў Хведар.

—Мала што каму ўздумаецца,—устаўляе слова рахункавод БРЫК.—Іх справа гаварыць, а мы калі захочам, тады і засеем. Сьпяшацца няма чаго.

Так адкрыта ў калгасе «Шлях да сацыялізму» сабатуюць весняную сяўбу, а партпрымацованы і разам з ім сакратар партыйнай ячэйкі ЛЕВІН і старшыня сельсавету (камуніст) ШМУРАТКА нават і ня думаюць рэагаваць на гэту злачынную зьяву.

—Хіба будзе з гэтага рэагаваньня якая-небудзь карысьць? спакойна разважае Шмуратка.

А вось што гаворыць на партыйным сходзе кандыдат партыі ЛІШАЕЎ, старшыня буйнога (100 гаспадарак) калгасу «Ленінскі шлях» у якім веснавая сяўба выканана толькі на 15 проц. І амаль зусім ня сеецца авёс.

—Плян мы выканаем... можам выканаць... у тэрмін калі-б, але... грязь, над вор'е дрэннае, коні слабыя...—І гэтак без канца. Між іншым, цягавая сіла ў гэтым калгасе ларанальна добрая.

У гэтым-жа калгасе ёсьць гора-камуніст ГРЫШАНАЎ Хведар, кіраўнік трэцяй брыгады. Ён яшчэ далей Лішаева зайшоў, абараняючы кулацкія традыцыі.

—Сяўбу мы закончым...

— Калі?

—Адным словам, у тэрмін мы закончыць ня можам, бо гэтыя тэрміны вызначаліся, бачыце, бяз уліку асаблівасьцяй нашых калгасаў...

А, да рэчы, гэтыя «асаблівасьці» такія. Брыгада №3 мае найбольш высокія глебы і распачала сяўбу яшчэ зарана да 1-га мая. Але мясцовыя камуністы «неэдагадаліся» арганізаваць ёй дапамогу з боку астатніх трох брыгад, дзе сіла большая і зямля ніжэйшая.

Нельга прамінуць і яшчэ аднаго Багушэўскага «спатыкача», загадчыка сельспажыўтаварыства ПАЎЛАВА. Ён ніадзавычай павольна зразумеў заданы вясковага камуніста ў правядзеньні ім новай сяўбы.

—Я,—кажа Паўлаў,—работнік кааперацыі і прымушаць мяне адрывацца на пасеўную ніхто ня мае права...Я пераружан...

Дапусьцім. Ну, а што ён зрабіў для таго, каб па лініі кааперацыі дапамагчы калгасам і працоўным адноасобнікам правесьці сяўбу? Коратка кажучы —нічога. Хіба-ж можна прымаць пад увагу, як дадатнае, тое, што ў калгасе «Ленінскі шлях» Багушэўскае сельспажыўтаварыства адкрыла парок, у якім прадае... піва і мяне на яйкі махорку.

Каб мець больш поўнае ўяўленьне аб ячэйцы, прыведзем некалькі фактаў, якія выявіліся ў часе партыйнага сходу. Грышанаў быў выключан з партыі 7 галасамі супроць... шасьці, прычым у ліку апошніх быў і старшыня сельсавету Шмуратка, які не палічыў патрэбным выступіць супроць, выкрыць апартуністычную сутнасьць такіх «камуністаў», як Грышанаў, Лішаеў і інш. Ён на гэтым сходзе выступаў толькі па выкліку пасобных членаў партыі, так сказаць, у парадку службовых абавязкаў.

Якая-ж ва ўсім гэтым роля сакратара партыйнай ячэйкі т. Левіна?

Гэты камуніст, з дазволу сказаць, кіраўнік ячэйкі ў сваёй рабоце ня ішоў далей бездапаможнага канстатаваньня, апартуністычнага фіксатарства бязьдзейнасьці камуністаў ячэйкі.

Выносячы прапанову аб тым, каб даць вымову Лішаеву, ён нават не знайшоў споў, каб яе абгрунтаваць...

Вывады напрошваюцца адны,—іх павінны зрабіць бюро Аршанскага РК КП(б)Б. І зрабіць, не чакаючы чысткі.

ВІТ. ДАЛЬ, М. РОСІН.

*З. Гінзбург*

## За разгорнуты савецкі гандаль на вёсцы

Пастанова ЦК КП(б)Б аб становішчы партыйнага кіраўніцтва работай Царыкаўскага і Нізкаўскага сельспажыўтаварыства, Касьцюковіцкага раёну («Зьвязда» ад 5 мая) мабілізуе раённыя і сельскія партыйныя, савецкія і кааперацыйныя арганізацыі на рашучую барацьбу за разгортваньне савецкага гандлю на вёсцы, ва арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне ССТ, як асноўнага зьвяна тавараснабжэньня вёскі.

Работа гэтых двух сельспажыўтаварыстваў зьяўляецца характэрнай для большасьці сельспажыўтаварыстваў БССР, якія яшчэ зусім слаба ажыцьцяўляюць ускладзеныя на іх адказнейшыя задачы.

Асноўны недахоп работы сельспажыўтаварыстваў заключаецца ў вельмі **слабым разгортваньні таваразвароту.** ССТ у большасьці сваёй яшчэ не арыентуелі тых вялікіх задач, якія ім даручаны, яны працуюць яшчэ па-старому. Работа іх характарызуецца нізкасьцю, непаваротлівасьцю ў мабілізацыі дадатковых тавараных рэсурсаў з мясцовых крыніц, нязменным дапамагчы пашырэньню вырабу прадметаў шырокага ўжытку на лініі прамкааперацыі і інш.

Гандлёвая дзейнасьць многіх ССТ заключаецца ў асноўным у тым, што яны атрымліваюць тавары з базы райсаюзу і прадаюць іх, самі не праяўляюць амаль ніякай ініцыятывы ў разгортваньні самазакупак. Значная частка сельспажыўтаварыстваў зусім не займаецца самазакупкамі (Амельканскае, В.-Борокае ССТ, Хойніцкага раёну; Халаменскае, Пралетарскае, Гарадоцкага раёну; Царыкаўскае і Нізкаўскае раёны), ня выпускаюць тавараў з мясцовых крыніц. Характэрнай у гэтых адносінах зьяўляецца работа **Ратамскага ССТ, Менскага раёну.** У сельсавеце наглядаецца вялікі попыт на гандлёвыя вырабы. У суседнім Астрашыцка-Гарадзецкім сельсавеце працуе гандлёвая арцель, але ратамскія кааператары не паклапаціліся закупіць вырабы гэтай арцелі. Загадчык крамы № 1 ратамскага ССТ проста гаворыць, што Ратамка недалёка ад Менску і спажывец можа ехаць у горад і на рынку купляць гаршкі.

Тыя сельспажыўтаварыстві, якія заняліся самазакупкамі, часта скажаюць прынцыпы гэтай работы. Яны закупляюць тавары ў гарадзкой гандлёвай сеткі, галоўным чынам у крамах Белгандлю. Такія самазакупкі не мабілізуюць дадатковых тавараных рэсурсаў і парушаюць савецкую палітыку цэн, бо на раздробную цану робіцца яшчэ адна накідка.

Вялікім недахопам зьяўляецца і тое, што нізавая кааперацыйная сетка вельмі слаба разгарнула гандаль недэфіцытнымі таварамі. Асартымэнт сельскіх крам вельмі абмежаваны, у радзе выпадкаў у краме няма вялікіх тавараў для продажу, апрача непалітка асартымэнту для стымуляваньня загатовак (Царыкаўскае, Нізкаўскае ССТ).

Вельмі рэдка можна знайсьці ў вясковай краме мэблю, гаспадарчыя тавары, гончарныя вырабы, гасьлітарэю і інш. У радзе выпадкаў сельская крама ператвараецца ў абмен ны пункт, бо ў ёй няма тавараў для нармальнага звароту, а ёсьць толькі тавары для стымуляваньня загатовак. Той факт, што за многіх сельспажыўтаварыстваў няма такіх неабходных тавараў, як мыла, гасьлітарэю і інш., ня можа зьявіцца апраўданьнем для кіраўнікоў гэтых сельспажыўтаварыстваў. Характэрнай у гэтых адносінах зьяўляецца работа **Ратамскага ССТ, Менскага раёну.** У сельсавеце наглядаецца вялікі попыт на гончарныя вырабы. У суседнім Астрашыцка-Гарадзецкім сельсавеце працуе гончарная арцель, але ратамскія кааператары не паклапаціліся закупіць вырабы гэтай арцелі. Загадчык крамы № 1 ратамскага ССТ проста гаворыць, што Ратамка недалёка ад Менску і спажывец можа ехаць у горад і на рынку купляць гаршкі.

Тыя сельспажыўтаварыстві, якія заняліся самазакупкамі, часта скажаюць прынцыпы гэтай работы. Яны закупляюць тавары ў гарадзкой гандлёвай сетцы

# ГЕРМАНІЯ пад ПАНАВАНЬНЕМ ФАШЫЗМУ

## На фашысцкі паёк

### Фашысцкая газэта прапануе зьнізіць жыцьцёвы ўзровень насельніцтва Германіі

БЭРЛІН, 19 (БЕЛТА). «**Дэйчэ Бэргверксцэйтунг**» публікуе ў якасьці перадавой памечаную Амстэрдамам карэспандэнцыю, у якой падкрэсьліваецца, што пяпрыхільнасьць да купілі германскіх тавараў у **Галяндыі**, якая пачала назірацца ўжо ў 1932 г., вельмі ўзмацнілася ў апошні час. Тымчасам Галяндыя—буйнейшы спажывец германскіх тавараў. **Германскія тавары ў Англіі, ПАЗШ, Бэльгіі, Галяндыі і іншых краінах сустракаюць перашкоды.** Усюды ў гэтых краінах разьвіваецца кампанія за спажываньне тавараў сваёй вытворчасьці.

Газэта прыходзіць да выводу, што адзіны «ратунак» для Германіі — зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню яе насельніцтва.

«Жыцьцёвы ўзровень павінен быць зьніжан. Гэта патрабуе моцных нэрваў, і міністэрства прапаганды здолее іх умацаваць. Толькі цяпер галеча, выкліканая прайгранай вайной, стукаецца ў германскія дзьверы з такой сілаю, што ўсе гэта чуюць.

«Немцы будуць зноў без фальшывага сораму насіць залатаны абутак і штаны, а шарсьцяныя тканіны, пасьля таго як зносяцца, будуць зноў перароблены ў штучную шэрсьць. Спажываньне мяса, піша газэта, павінна быць абмежавана, а спажываньне тлушчаў зьменшана ў значнай ступені. Павінны быць устаноўлены вялікія абмежаваньні для спажываньня імпартных харчовых прадуктаў, а таксама большасьці іншых тавараў».

### Турма за апашленьне фашысцкага сымбалю

БЭРЛІН, 20. (БЕЛТА). Урад зацьвердзіў закон, які прадугледжвае штрафы і турму за «апашленьне сымбалю нацыянальнай рэвалюцыі». У якасьці прыкладу такога «апашленьня» «**Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг**» прыводзіць зьяўленьне ў продажы сасісак, якія маюць форму свастыкі.

***

БЭРЛІН, 19. (БЕЛТА). Учора паліцыя зрабіла масавыя вобыскі ў радзе паселішч пад **Бэрлінам.**

18 мая ўвечары арыштован уцёкшы з турмы каменшчык **Хільпрэхт**, які падазраецца ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі.

### УРАД ПАЗШ АПУБЛІКАВАЎ АДКАЗ ТАВ. КАЛІНІНА

ВАШЫНГТОН, 19. (БЕЛТА). «**Белы дом**» (рэзыдэнцыя прэзыдэнта) апублікаваў у друку тэкст адказу старшыні ЦВК СССР тав. **Калініна** на зварот прэзыдэнта Рузвэльта.

## Антыяпонская дэманстрацыя Рузвэльта

ВАШЫНГТОН, 19. (БЕЛТА). **Рузвэльт** і прадстаўнік Кітаю **Сунь Цзэвень** апублікавалі сумесную заяву, у якой гаворыцца: «Завяршаючы нашы гутаркі, адзначаем з глыбокім задаваленьнем, што мы аднэй думкі з повазу мор, якія павінны быць прыняты для вырашэньня асноўных праблем, што стаяць зараз перад сьветам. Мы горача спадзяемся, што мір можа быць забясьпечан і што з гэтай мэтай у хуткім часе будуць прыняты практычныя меры ў галіне разбраеньня. У гэтай сувязі нашы думкі, натуральна, зьвярнуліся да сур'ёзных падзей на Далёкім Усходзе, якія парушаюць усеагульны мір апошнія два гады. Мы спадзяемся, што варожыя дзеяньні хутка спыняцца, з тым, каб цяперашнія намаганьні ўсіх краін, накіраваныя на аднаўленьне палітычнага і эканамічнага міру, змаглі мець пасьпяховыя рэзультаты».

## Пёжаі імпэрыялізму апраўдваюць сваіх германскіх братоў

### Сэсія бюро II Інтэрнацыяналу

ПАРЫЖ, 18 (БЕЛТА). У ПАРЫЖЫ адбылася сэсія бюро II Інтэрнацыяналу, з удзелам прадстаўнікоў сацыялістычных партый ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ, БЭЛЬГІІ, ЧЭХА-СЛАВАКІІ, ГАЛЯНДЫІ, АЎСТРЫІ і некаторых эміграцкіх груп. Прадстаўнікі германскай сацыял-дэмакратыі адсутнічалі. Ход сэсіі і яе пастановы наглядна паказалі, што ЎСЕ ПАРТЫІ ДРУГОГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ, ПАДОБНА ГЕРМАНСКІМ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАМ, У САПРАЎДНАСЬЦІ ВЫСТУПАЮЦЬ НА АБАРОНУ НАЦЫЯНАЛІСЦКАЙ ПАЛІТЫКІ СВАІХ УРАДАЎ, толькі прыкрываючыся фразамі аб «барацьбе» су проць фашызму.

Бюро аднагалосна прыняло пастанову, у якой заклікае ўсе свае сэкцыі «змагацца супроць замежнай палітыкі германскага фашызму і, у прыватнасьці, патрабаваньня германскага ўраду аб дадатковым узбраеньні. Прабуючы апраўдаць пазыцыю сацыял-дэмакратычнай фракцыі рэйхстагу, бюро далей заяўляе, што фракцыя галасавала за прапанаваную фашыстамі рэзалюцыю «ў рэзультаце гвалту над сумленьнем сацыял-дэмакратычных дэпутатаў».

Бюро парашыла ня прымаць удзелу ў Эўрапэйскім антыфашысцкім кангрэсе, які склікаецца ў пачатку чэрвеня ў КАПЭНГАГЕНЕ.

Бюро пастанавіла склікаць у Парыжы 20 жніўня міжнародную канфэрэнцыю сацыялістычных партый.

## *З японска-кітайскага фронту*

## Налёт японскіх аэраплянаў на Бэйпін і Цяньцзін

ШАНХАЙ, 20 (БЕЛТА). Учора некалькі груп невядомых, узброеных рэвальвэрамі, прабавалі выклікаць бес парадкі ў кітайскай частцы **Цяньцзіну** і, пасьля 2-гадзіннага бою з кітайскай паліцыяй, адступілі.

Паводле вестак агэнцтва «**Рэйтэр**» гэтыя групы зьвязаны з былым Фынюй-сінаўскім генэралам **Шы Ю-Сянам**, нядаўна прыбыўшым на Поўнач. Учора-ж японскія войскі разброілі ахову Цяньцзінскага унівэрсы тэту, адкрыўшы перад гэтым страляніну. Сёньня японская канцэсія ў Цяньцзіне закрыта для руху. На іншых канцэсіях замежныя гарнізоны прыведзены ў баявую гатоўнасьць.

Раніцою над Цяньцзінам ляталі тры японскія самалёты. Японскія ўлады прапанавалі японскім рэзыдэнтам у Цяньцзіне сабрацца ў памяшканьні японскіх казармаў. Сёньня **над Бэйпінам зьявілася 11 японскіх самалётаў.** Насельніцтва хаваецца.

### Генэральскія паўстаньні ў Кітаі

ШАНХАЙ, 20 (БЕЛТА). Як паведамляюць з японскіх крыніц, генэрал **Лі Цзя-сянь** абвясьціў сябе камандуючым «аўтаномнай арміі паўночнага Кітаю» і з 2.000 салдат выступіў супроць часьцей **Хо-Цзуго** ў напрамку **Цяньцзіну.** Лёзунгі ўказанай «арміі» носяць антыяпонкінскі і антыгаміндаўскі характар. Далей, з тых-жа японскіх крыніц паведамляюць аб паўстаньні генэрала **Дуі**, колькасьць арміі якога невядомая. У самым **Цяньцзіне становішча надзвычай напружанае.**

## АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

## Францускі парлямант ухваліў франка-савецкі пакт аб ненападзе

ПАРЫЖ, 19 (Белта). У прамове ў палаце дэпутатаў аб франка-савецкім пакце ненападу **БОНКУР** асабліва адзначыў, што пакт падпісан «з вялікаю краінай, якая заўсёды будзе буйной фігурай на сусьветнай шахматнай дошцы». «Гэтым пактам,—сказаў Бонкур,—вялікая Расія ўвайшла ў сыстэму нашых згод. Ня ўключаючы пункту аб узаемным падтрыманьні і больш дакладных абавязацельстваў, якія прымаюцца членамі Лігі нацый, пакт зьмяшчае асноўны момант, які заключаецца ня толькі ў адмаўленьні ад агрэсіі ў адносінах Францыі, але таксама і ў абавязацельстве захоўваць нэйтралітэт, калі Францыя падпадзе нападу з боку трэцяй дзяржавы».

Гаворачы аб франка-савецкіх гандлёвых перагаворах, Бонкур адзначыў, што пасьля падпісаньня пакту перагаворы аднавіліся з вялікай актыўнасьцю. Ён заявіў, што прапановы, якія абмяркоўваліся, знаходзяцца напярэдадні іх прыняцьця савецкім урадам.

У заключэньне Бонкур дапусчаецца да слоў дакладчыка **ТАРЭСА** і заяўляе: «Усё такі дзякуючы гэтаму пакту пазыцыя Францыі ва ўсім сьвеце ўмацавалася».

**ПАЛАТА ДЭПУТАТАЎ УХВАЛІЛА АДНАГАЛОСНА, 520 ГАЛАСАМІ, ФРАНКА-САВЕЦКІ ПАКТ АБ НЕНАПАДЗЕ.**

***

ПАРЫЖ, 20 (Белта). За выключэньнем «ЖУРНАЛЬ ДЭ ДЭБА», якая выступае са звычайнымі антысавецкімі выпадамі, ГАЗЭТЫ ЎХВАЛЯЮЦЬ ПРЫНЯТУЮ ПАЛАТАЙ РЭЗАЛЮЦЫЮ АБ ФРАНКА-САВЕЦКІМ ПАКЦЕ.

«ЭР НУВЭЛЬ» указвае, што пакт павінен мець сваім рэзультатам стабілізацыю становішча на Ўсходзе. «РЭПЮБЛІК» адзначае дзьве выгады, якія Францыя атрымала ад франка-савецкага пакту: 1) пакт сур'ёзна ўмацоўвае мір, 2) пакт палягчае франка-савецкія гандлёвыя перагаворы і стварае абстаноўку давер'я, што зьяўляецца абавязковай прадпасылкай эканамічнай згоды. Газэта заканчвае заклікам не даваць іншым краінам заўладаць савецкім рынкам.

«ПЦІ ЖУРНАЛЬ» ВЫСТУПАЕ СУПРОЦЬ ДАЛЕЙШАГА ІСНАВАНЬНЯ Ў ПАРЫЖЫ «ГРУЗІНСКАЙ МІСІІ». «ЖУРНАЛЬ» падкрэсьлівае ўзросшую ўдзельную вагу СССР на міжнароднай арэне.

## Разгул фашысцкіх бандаў у Данцыгу

ВАРШАВА, 20 (Белта). Нацыянал-сацыялісты разагналі мітынг нямецкіх нацыяналістаў, на якім павінен быў выступіць прэзыдэнт ЦІМ. Нацыяналісты ў сваёй адозьве патрабуюць высылкі штурмавікоў з Данцыгу назад у Германію.

На вуліцах Данцыгу зьявіліся члены «Штальгельму» ў мундзірах і ў сталёвых шлёмах. КАМУНІСТЫ, ЯК ГЛЕДЗЯЧЫ НА РЭПРЭСІІ, ЗАБАРОНЫ ВЫДАВЕЦТВАЎ І АРЫШТЫ ВЫДАТНЫХ ДЗЕЯЧОЎ (зьяволен у турме дэпутат фолькстагу ПЛЕНІКОЎСКІ), АРГАНІЗУЮЦЬ АДЗІНЫ РАБОЧЫ АНТЫФАШЫСЦКІ ВЫБАРЧЫ ФРОНТ.

Газэта «Роботнік» піша, што прыбыўшыя ў Данцыг новыя атрады нацыянал-сацыялістаў разграмляюць перадвыбарчыя сходы с.-д. і мітынгі кіруючай партыі «ДЭЙЧ НАЦЫЯНАЛЕ». Згодна вестак газэты, нацыянал-сацыялісты падрыхтавалі «чорны сьпіс» сваіх палітычных праціўнікаў, якія пасьля 28 мая (дзень данцыгскіх выбараў) «павінны быць вывезены ў Германію для зьняволеньня ў канцлягеры. Паліцыя цалкам на баку штурмавікоў. Згодна іх патрабаваньню з учарайшага дня данцыгскія бібліятэкі не выдаюць кніг левых аўтараў.

ВАРШАВА, 19. (БЕЛТА). Польскія газэты друкуюць тэлеграмы з **Данцыгу**, у якіх гаворыцца аб антыпольскіх выступленьнях данцыгскіх нацыянал-сацыялістаў. У сувязі з пагражаючымі паводзінамі нацыянал-сацыялістскіх штурмавікоў, польскія і яўрэйскія купцы ліквідуюць сваё гандлёвыя прадпрыемствы ў Данцыгу.

Учора камісар Лігі нацый Данцыгу **Ростынг** прыбыў у Варшаву і бачыўся з міністрам замежных спраў **Бэкам.** Ростынг адмовіўся даць журналістам якія-небудзь паведамленьні аб мэце сваёй паездкі ў польскую сталіцу.

## Канфэрэнцыя па разбраеньні апынулася ў тупіку

ЖЭНЭВА, 19 (Белта). Пасяджэньне генэральнай камісіі канфэрэнцыі па разбраеньні, **Гендэрсон** сказаў антымістычную прамову, у якой спыніўся на звароце Рузвэльта, на прамове Гітлера і, пераходзячы да прапаноў аб разбраеньні, заявіў, што на яго думку гэтыя прапановы даюць дэлегацыям магчымасьць узяць назад большасьць унесеных імі паправак.

**Надольны** (Германія) заявіў, што пазыцыя германскай дэлегацыі ў далейшым будзе адпавядаць палажэньням, выказаным у прамове Гітлера. Канфэрэнцыя павінна прывесьці да ўстанаўленьня бясьпечнасьці шляхам разбраеньня моцна ўзброеных дзяржаў і да ажыцьцяўленьня роўнаправя Германіі. Ангельскі праект—база, на якой гэтыя праблемы маглі-б найсьці вырашэньне.

Такім чынам, Надольны, ня гледзячы на намёкі Гендэрсона, ня ўзяў назад унесеных раней германскіх паправак.

**Тэфік Рэшцю-бэй** (Турцыя), вітаючы зварот Рузвэльта, заявіў, што Турцыя ў пытаньні аб разбраеньні ідзе далей ангельскага пляну.

**Ідэн** (Англія) заявіў, што калі дух, якім была прасякнута заява Надольнага, будзе панаваць у далейшай рабоце канфэрэнцыі, дык гэта магло-б прывесьці да посьпеху яе работ. Вітаючы прапанову Рузвэльта, Ідэн прапануе прыняць ангельскі плян і падкрэсьлівае, што было-б вельмі важна дамагчыся згоды па пытаньнях аб асабовым складзе арміі і аб ваенных матар'ялах. Ён прапануе прыняць у агульнай форме разьдзелы ангельскага праекту па гэтых пытаньнях, указваючы, што прыняцьце кожнага артыкулу праекту будзе зьвязана з прыняцьцем іншых яго артыкулаў.

**Масылы** (Францыя), падкрэсьліваючы важнасьць звароту Рузвэльта, гаворыць, што выступленьне Надольнага дае магчымасьць Германіі супрацоўнічаць у рабоце канфэрэнцыі, і заяўляе, што цяпер траба прыступіць да канкрэтнай работы. Такім чынам, Масылы падкрэсьлівае адказнасьць Германіі за апошні крызіс канфэрэнцыі.

У заключным слове **Гендэрсон** прапанаваў, каб заўтрашняе пасяджэньне прыступіла да абмеркаваньня другога разьдзелу ангельскага праекту, які датычыць пытаньняў аб асабовым складзе арміі і аб ваенных матар'ялах. **Прапанова прынята.**

## Прывітаньне тав. Шліхтэра

Беларуская Акадэмія Навук атрымала тэлеграму ад акадэміка Шліхтэра ў сувязі з прыездам у Менск дэлегацыі акадэмікаў Усеукраінскай Акадэміі Навук.

Тав. Шліхтэр у сваёй тэлеграме выказвае ўпэўненасьць, што зьліяньне Беларускай і Украінскай акадэмій «дадуць пралетарыяту матар'ялы ў сэнсе навукі і практыкі нашай барацьбы пад кіраўніцтвам партыі за пабудову сацыялізму, нацыянальную палітыку Леніна, дыктатуру пралетарыяту, умацаваньне калгасаў». Тав. Шліхтэр шкадуе, што хвароба перашкаджае яму асабіста прыехаць.

## Ліст у рэдакцыю

Прызнаю зусім правільнай крытыку «Зьвяздой» памылак у маім артыкуле «Маркс—Энгельс—Ленін—Сталін».

Само сабой зразумела, што толькі адсутнасьцю выстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці з майго боку можна тлумачыць дапушчаныя ў гэтым артыкуле такія грубыя палітычныя памылкі і неахайнасьці.

Запэўняю, што ў барацьбе за высокую бальшавіцкую прынцыповасьць і павышэньне якасьці сваёй работы выпраўлю дапушчаныя мною памылкі.

З тав. прывітаньнем Я. ЛЕВІН.

# УКРАІНСКІЯ ВУЧОНЫЯ Ў МЕНСКУ

19 мая ў канфэрэнц-залі Акадэміі Навук Беларусі адбылася першая сустрэча ўкраінскіх вучоных з акадэмікамі і навуковымі работнікамі БАН і іншых навуковых і культурных устаноў Менску.

Прэзыдэнт АНБ акадэмік т. П. ГОРЫН

Госьці былі горача спатканы прадстаўнікамі навуковых і грамадзкіх арганізацый у перапоўненай аўдыторыі.

Сход адкрыў прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук тав. **Горын.**

### *Выступленьне тав. Горына*

— Прыезд групы вучоных усеукраінскай Акадэміі Навук, — сказаў **т. Горын,** — мае мэтай падзяліцца з намі навуковымі дасягненьнямі брацкай Украінскай Савецкай Рэспублікі. Прабываньне ў сяценах нашай Акадэміі выдатных вучоных Украіны дазволіць і ім непасрэдна азнаёміцца з работай Беларускай Акадэміі Навук і дапамагчы ў яе далейшай рабоце. Факт прыезду да нас выдатных вучоных Украіны, бязумоўна — выдатная падзея для навукі БССР, але было-б вялікім недахопам нашай сустрэчы захапляцца парадняснасьцю, непатрэбнай для навукі. Наша сустрэча мае значэньне для навукі і ставіць сваёй мэтай дзеławое абгаварэньне навуковых праблем і практычнае скарыстаньне дасягненьняў Усеукраінскай Акадэміі ў нас, у БССР. Гэта відаць з самой тэматыкі дакладаў і наша задача, каб даклады украінскіх акадэмікаў выклікалі шырокае абгаварэньне з нашага боку.

У дзень прыезду вучоных Украіны не пашкодзіць яшчэ раз напомніць, што вучастак навукі ў нашы дні зьяўляецца аб'ектам жорстких нападаў з боку клясавых ворагаў. Клясавы вораг, разумеючы, якая вялікая роля выпадае на долю навукі ў сацыялістычным будаўніцтве, усяляк прабуе дэзарганізаваць фронт савецкай навукі. Нядаўна апублікаваны артыкул у «Правде» (27 красавіка) аб тым, як буржуазна-нацыяналістычныя элемэнты арудавалі ва Ўсеукраінскай Акадэміі Навук, як яны шкодзілі савецкай навуцы — заслугоўвае сур'ёзнай увагі і вымагае ад нас павышэньня клясавай пільнасьці. У гэтых умовах наша сустрэча павінна паставіць задачай кансалідацыю сіл савецкіх вучоных для далейшай барацьбы з клясавымі ворагамі, для далейшага змаганьня за ператварэньне Ўсеукраінскай і Беларускай Акадэміі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў праваднікоў ленінскай нацыянальнай палітыкі, у цэнтры нацыянальных культур, сацыялістычных па сваім зьмесьце. Работа нашых Акадэмій павінна даваць узоры інтэрнацыянальнага выхаваньня мас.

Тав. **Горын,** вітаючы гасьцей, выказвае надзею, што прыезд вучоных Украіны адыграе вялікую ролю ў справе кансалідацыі сіл для барацьбы з клясавым ворагам, каб у гэтай барацьбе, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі забясьпечыць далейшае бурнае разьвіцьцё Усеукраінскай і Беларускай Акадэмій, як буйных навуковых цэнтраў Савецкага Саюзу.

### *Выступленьне прэзыдэнта УАН акад. т. А. А. Багамольца*

Шумнымі воплескамі ўсёй аўдыторыі было спаткана зьяўленьне на трыбуне прэзыдэнта Ўсеукраінскай Акадэміі навук акадэміка **А. А. Багамольца.**

— На нашу долю, — сказаў акадэмік **Багамолец,** — выпала шчасьце жыць і працаваць у грандыёзную па сваіх задачах гістарычную эпоху, эпоху сацыялістычнай перабудовы жыцьця чалавецтва.

На аднэй шостай частцы зямной кулі, на бязьмежных прасторах СССР разгарнулася пераможна сацыялістычнае будаўніцтва. У чатыры гады выкананы заданьні першай пяцігодкі, якія здаваліся фантастычнымі ворагам сацыялізму. Ідзе першы год другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

— Мы, — кажа далей прамоўца, — не сумняваемся ў яе посьпеху, не сумняваемся, што будуць дасягнуты пастаўленыя перад ёю вялікія мэты. У іх ажыцьцяўленьні асабліва адказная і асабліва ганаровая роля выпадае на долю навукі.

Гэта добра разумеюць і ворагі сацыялізму. Навука партыйна. **В. І. Ленін** з асаблівай выразнасьцю паказаў ілжывасьць сьцьверджаньняў аб апалітычнасьці навукі. Ва ўмовах буржуазнага грамадзтва навука зьяўляецца магутнай зброяй прыгнечаньня працоўных.

У нас навука заклікана служыць вызваленьню чалавецтва ад ярма капіталізму. У нас яна выконвае пастаўленую перад ёй **К. Марксам і Леніным** і вырашаемую сёньня кампартыяй, пад кіраўніцтвам **т. Сталіна** задачу — ня толькі растлумачыць сьвет, але і сацыялістычна зьмяніць, перабудаваць яго.

Значэньне навукі для будаўніцтва сацыялізму добра разумеюць і ворагі сацыялізму. Адсюль шкодніцтва на навуковым фронце, клясавая барацьба, якая ня спыняецца і на гэтым фронце. Ня буду спыняцца на яе шматлікіх прыкладах, якія вывяліся за гады, што прайшлі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Напомню толькі нядаўна выкрытую спробу скажаць ленінскую нацыянальную палітыку, лінію стварэньня культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце. Гэтая спроба знайшла сваё адлюстраваньне ў скрыўленьні работ па мовазнаўстве, мэтай якіх было спрыяць разьвіцьцю нацыянал-шавіністычных тэндэнцый.

Таварышы, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы на навуковым фронце, ва ўмовах напружанай барацьбы за сацыялізм, аб'яднаная дружная пляновая работа Акадэміі Навук нашага Саюзу набывае асабліва вялікае значэньне. Сустрэча навуковых працаўнікоў усебеларускай і ўсеукраінскай акадэмій навук, павінна паслужыць новым крокам уперад па шляху разьвіцьця навукі ў нашым Саюзе, па шляху далейшай увязкі навуковай работы з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Культура, эканоміка дзьвёх суседніх брацкіх сацыялістычных рэспублік —Беларусі і Украіны, мае шмат агульных задач і аднолькава вялікае значэньне таксама і для ўсяго СССР. Назаву ўжо праблемы Вялікага Дняпра, якія разам распрацоўваюцца нам, праблемы Палесься і інш.



Прэзыдэнт УАН акадэмік тав. А. А. БАГАМОЛЕЦ.

Дазвольце выказаць упэўненасьць,— закончыў сваё ўступнае слова акадэмік **Багамолец,**—што, становячыся на шлях сумеснай навуковай работы, БЕЛАН і УАН з гонарам выканаюць указаньні партыі і ўраду аб неабходнасьці далейшага паглыбленьня навуковай работы, яе плянаваньня, аб неабходнасьці комплекснага вывучэньня праблем, якія маюць актуальнае значэньне для патрэб сацыялістычнага будаўніцтва.

***

На гэтым-жа сходзе акадэмік **Багамолец** прачытаў даклад на тэму **«Мэханізм рэгуляваньня вугляводнага абмену».**

***

Сёньня, **21 мая** адбудуцца наступныя даклады:

Акадэмік **А. А. БАГАМОЛЕЦ** прачытае даклад на тэму «Пераліваньне крыві» (Унівэрсытэцкі Гарадок, Апатамічны Корпус), а 7 г.

Акадэмік **А. Фамін**—«Дасягненьні ў галіне батанікі ў СССР» (Біялёгічны Інстытут Бел. АН, Ленінская, 29-35, а 1 г. дня.

Прафэсар **М. Н. Камышан**—«Марксізм і яго эпоха» (Інстытут Гісторыі Бел. АН, Ленінская, 29-35, пакой № 37, а 7 г. ўвечары.

Акадэмік **С. Ю. Семкоўскі**—«Марксізм і прыродазнаўства. (Канфэрэнц-заля Бел. АН, Ленінская, 29-35), а 7 г. ўвеч.

Акадэмік **М. В. Птуха**—«Эвалюцыя сьмяротнасьці ў Беларусі да пачатку 1-й пяцігодкі». (Інстытут Сацыяльнай гігіены, Кастрычніцкая, 24), а 7 г. ўвеч.

Праф. **Шабліёўскі**—«Асноўныя праблемы маркса-ленінскага шэўчэнказнаўства» (Інстытут Літаратуры Бел. АН Ленінская, 29-35, 3-ці паверх, пакой № 39), а 1 г. дня.

Уваход вольны.

***

22 мая, а 1 гадзіне дня, у памяшканьні БАН адкрываецца чарговая сэсія Беларускай Акадэміі Навук. Сэсія працягнецца да 25 мая.

На парадку дня: 1) Праблема Вялікага Дняпра (дакладчыкі—першы віцэ-прэзыдэнт БАН праф. **Домбаль** і акадэмік **Пятровіч**; 2) зацьвярджэньне статуту Акадэміі Навук (дакладчык прэзыдэнт БелАН акад. **Горын**); 3) да выбары новых акадэмікаў (дакладчык неадменны сакратар БелАН акад. **Панкевіч**).

У рабоце сэсіі прымуць удзел украінскія вучоныя.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.


Пазыкі—выпрабаваная зброя пралетарыяту ў будаўніцтве сацыялізму за свой уласны пралетарскі кошт.

Сіла наша ў тым, што мы будуем сацыялізм уласнымі сродкамі „Без кабальных крэдытаў і пазык звонку" (СТАЛІН).

У годам у пазыцы другой пяцігодкі, у ім экзаменуюць незалежнасьць СССР, у чым цтом абароназдольнасьць нашай краіны.

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!

ГАВОРЫЦЬ МЕНСК

УВАГА!

28-га МАЯ г. г. у 8 гадзін. увечары адбудзецца

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁ-НАРАДА

ПА ПЫТАНЬНІ АБ ХОДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ПА БССР.

На радыёвузлах ля мікрафона прысутнічаюць: агітмасы РК і ячэек КП(б)Б, РК ЛКСМ, старшыні райпрафсавету, раённыя і нізавыя камсолы, старшыні РМК союзу ФВР, фінорганы, прадстаўнікі рэдакцый газэт і апорных прадпрыемстваў, МТС, саўгасаў, калгасаў групавыя брыгадныя агітатары і ўдарнікі фінфронту.

Пасьля нарады—ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ сіламі ўсебеларускага камітэту радыёвяшчаньня.

ТАВАРЫШЫ!

Арганізуйце масавае слуханьне ў рабочых і калгасных клюбах, дамох сельскай культуры, МТС, калгасах, саўгасах, мардомах, школах і ўсіх калектывах.

Перанясеце лепшыя формы і мэтады работы па рэалізацыі пазыкі на ўсе калектывы вашага району.

Агітпрап ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ.

Ударнікі і ўдарніцы, будзьце першымі ў падпісцы на пазыку другой пяцігодкі, арганізуйце разьяшчэньне пазыкі сярод працоўных.



АЛЁ!... АЛЁ!... АЛЁ!...

Фабрыкі, заводы, саўгасы, калгасы і вёскі, патрабуйце ад ашчадкас і камсодаў выслаць брыгады для суцэльнай праверкі аблігацый рабочых, служачых, калгасьнікаў і аднаасобнікаў, вылуленьня і аплаты на месцы выйгрышаў.

Ведайце, што сярод аблігацый, якія знаходзяцца на руках, ёсьць шмат выйгрышных, па якіх ня выплачаны выйгрышы.

Аб нячуткасьці ашчадкас і камсодаў званеце на тэлефону і пішэце па адрасу: Менск, Савецкая, 45, Кіраўніцтву ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР. Тэлефоны: начальніка—№ 21-147, сэктару дзяржаўных пазык—№ 21-148.

Рэалізацыю новай пазыкі суправаджаем масавай праверкай, выяўленьнем і аплатай выйгрышаў.

Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР.



ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА

НА ЧАСОПІСЬ КУЛЬТПРОПУ ЦК КП(б)Б

па кіраўніцтву раённымі газэтамі, фабрычна-заводзкімі, эмтэзэсаўскімі, саўгаснымі шматтыражнымі

„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК"

ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ У МЕСЯЦ

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсюды (паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і лістаносцамі.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на адзін месяц—1 руб.; тры месяцы—3 руб.; да канца году—8 руб.

Выдавецтва „Зьвязда"



ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. 2-ая сэрыя 2-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" Мастацкі фільм НЯМЫ ВАРЫЯНТ Пуцёўка ў жыцьцё драма ў 34 эпізодах

„СПАРТАК" Каса адкрыта з 3 г. 30 м. Мастацкі фільм ХРАМЫ БАРЫН драма ў 7 частк.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка Каса з 1 г. дня. Дзіцячыя сэансы ШЫНЭЛЬ ГОГАЛЯ у 7 част. Вячэрнія сэансы гукавы фільм „Інтэрнацыянал" у 2-х ч. „Шынэль" Гогаля у 7 ч.



Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 21-га мая

НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ З ЭПОХІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

ПЯЦЬ НЯВЕСТ

У ГАЛ. РОЛЯХ:

Лейзер—А. БУЧМАН,

Міра, яго дачка—Т. АДЭЛЬГЭЙМ,

Местачковы багатыр—М. ЛЯРАЎ,

Вач. Пятлюраўск. атраду—С. ШАГАЙДА,

Ёсель-дыёт—А. БУЧМА.

Зьвыш праграмы кіно-хроніка САЮЗКІНО. Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса ад 1 г. дня



Курсы ВОСУ

АРГАНІЗУЮЦЬ ГРУПУ

БУХГАЛТАРОЎ

для Белуціля для працы на раёне.

Стыпэндыя ад 100 да 150 руб. у м-ц і кватэрных 25 р. інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца. Прымаюцца пам. бухг. або рахункаводы ня менш чым з аднагадовым стажам па падвойнай сыстэме бухгальтэрыі.

Заявы з дакумантамі аб сац. становішчы, аб адукацыі (ня менш 7 груп), аб узросьце (ня менш 18 г.), аб стажы, аб вызваленьні ад працы (для працуючых), аб згодзе праўленьня (для калгасьнікаў) прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, Камуністычная, 16, пак. № 10) ад 10 да 12 г. штодзённа да 30 мая. Заявы без адпаведных дакумантаў разглядацца ня будуць.



АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР

восьмага мая 1933 г. на падставе арт. 2-4 палаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (збор закон. і загад СССР № 8, паст. 99),

ЗАРЭГІСТРАВАНЫ

у рэестры юрыдычных асоб за № сто сорак сёмым статут

Беларускага Уцільнага Саюзу Прамысловай Каапэрацыі

„БЕЛУЦІЛЬПРАМСАЮЗ".

Саюз уваходзіць у сыстэму Белкаапрамсавету.

Ядрас Саюзу: г. Менск, Пляц Волі, 4,

Разьліковы рахунак у Бел. К-ры Дзяржбанку № 105-4208.



СЭКТАР КАДРАЎ НКФ БССР

абвяшчае ПРЫЁМ

на Гомельскія 8-месячныя

ФІНАНСАВЫЯ КУРСЫ

падрыхтоўкі

інспэктараў-бухгальтараў.

Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 70 да 150 руб. у месяц у залежнасьці ад пасьпяховасьці.

Заявы прымаюцца да 28 мая. Да заявы павінны быць абавязкова прыкладзены наступныя дакумэнты: даведка аб адукацыі, даведка аб рабочым і службовым стажы, камандыроўка ад райфа або заявы з дакумантамі накіроўваць на адрасу: Гомель, Фінансава-вучэбны камбінат, Чырвонаармейская вул. д. № 5, сэктар кадраў.

Сэктар кадраў НКФ БССР.



ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА" ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА

ЗВАРАЧАЦЦА:

Савецкая, 63, 2-гі паверх.



Згубленыя і ўкрадзеныя дакумэнты лічыць несапраўднымі

Партбілеты: Гуя М. Я. выд. Днепрапятр. арг. УсеКП(б), Хоцін І. М., выд. Койданаўскім гарномам КП(б)Б за № 1301276, Куркоў А. М., выд. Абшранск. арг. УсеКП(б) за № 0654231, Хасін М. Х. выд. Аршанск. АК КП(б)Б за № 1300953, Вайцехоўскі Я. В., выданым Менскім АК КП(б)Б, Чыжык Т. Ф., выд. ДПК—2 за № 0415412, Одынец О. К., выд. Гомельскім АК КП(б)Б за № 0898656, Сівачоў А. В., выд. Менскім ГК КП(б)Б за № 2723183, Бас Б. М., выд. Менскім Гарномам КП(б)Б за № 2403259, Лагуновіч М. Я. выд. Плешчаніцкім РК КП(б)Б, Сандлер С. Е., выд. Аршанскім АК КП(б)Б за № 1300912, Васілец В. Г., выд. Менскім гарномам КП(б)Б, Роваи А. Р. выд. Мен. ГК КП(б)Б за № 18158, Нікаенка Е. І., выд. ДПК-7 за № 1971574, Самсаненка Н. А., выдан. ДПК-2. Кунцэвіч П. М. выд. Менскім АК КП(б)Б за № 0815495.

Кандыдацкія карткі: Крук І. А., выд. Барбруйскім РК КП(б)Б, Сеноц М. А. выд. Менскім ГК КП(б)Б, Свядольчык